23-25 кастрычніка

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Ветракі ☞ 4

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 43 (2789) Год LIV | Беласток, 25 кастрычніка 2009 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Тысяча дзевяцьсот сорак адна

— Дамова аб малым памежным руху паміж Польшчай і Беларуссю будзе падпісана ў канцы лістапада, пасля дваццатага, — паінфармаваў „Ніву" ў час эканамічнага форуму „Добрасуседства" ў Седльцах першы віцэ-прэм'ер Рэспублікі Беларусь Уладзімір Сямашка. — У Варшаву прыедзе наш міністр замежных спраў Сяргей Мартынаў. Пасля працэдура ўступлення дамовы ў сілу, як звычайна ў такіх выпадках, зойме дваты месяцы. На маю думку, людзі змогуць пакарыстацца гэтай дамовай толькі пасля Новага года.

Дзень раней (13 кастрычніка) у Беластоку, на запрашэнне шэфа падляшскіх структур Грамадзянскай платформы, прабываў польскі віцэ-міністр замежных спраў Ян Баркоўскі. Прадставіў ён спісак мясцовасцей, якія з польскага боку апынуцца ў зоне ахопленай палёгкамі ў перасяканні мяжы. Агулам іх ёсць 1941, з чаго на Падляшшы — 1265, апошнія ў Люблінскім і Мазавецкім ваяводствах. Прынята — згодна з распараджэннем Еўрапарламента з 2006 г. — што абшар, у якім будзе адбывацца малы рух ахопіць па абодвух баках 30 кіламетраў „плюс". Гэта значыць, што мясцовасці, якія знаходзяцца па-за тымі 30 кіламетрамі, але распаложаны на тэрыторыі гміны, якой хоць частка знаходзіцца ў трыццацікіламетровай паласе, ахопіць малы памежны рух. На Падляшшы гэты пояс цягнецца з поўначы ад Пунска да Мельніка на поўдні, ахопліваючы з большых гарадоў м.інш. Сямятычы, Бельск-Падляшскі, Гайнаўку і Саколку. Па-за зонай апынуўся Беласток, хоць дзякуючы прынцыпу „30 плюс" на абшары МПР будуць такія мясцовасці як распаложаныя непадалёк Беластока Грабоўка ў Супрасльскай ці Дайліды-Гурныя ў Заблудаўскай гмінах. З беларускага боку ў зоне МПР апынулася 670 мясцовасцей (з пасёлкаў і сельсаветаў, між імі — Брэст і Гродна).

Адкрываючы сустрэчу ў Падляшскай ваяводскай управе з самаўрадаўцамі гмін, распаложаных пры беларускай мяжы, і падляшскімі прадпрымальнікамі, міністр Баркоўскі агаварыўся:

— Няма сумненняў, што Польшча справілася б без Беларусі, але нашым абавязкам з'яўляецца ўтрыманне партнёрскіх адносін. Мы паставілі сабе мэтай нармалізацыю стасункаў з Беларуссю.

Успомніў прытым аб неабходнасці захоўвання ў Беларусі правоў польскай меншасці:

— Прагнем, каб палякі трактаваліся нармальна, каб былі раўнапраўнымі грамадзянамі Беларусі. Каб былі лаяльнымі ў адносінах да Беларусі. Не патрабуем лаяльнасці ў адносінах да Польшчы. Зняцце з палітычных планаў спраў польскай меншасці было б з карысцю для ўсіх. Стваранне напружанняў нікому не нясе карысці.

Спаслаўся таксама на ініцыяваную Польшчай і Швецыяй еўрасаюзную праграму „Усходняе партнёрства", якая датычыць Украіны, Малдовы, Арменіі, Азербейджана, Грузіі і Беларусі. Да падзелу ў рамках дапамогі гэтым краінам маецца пакуль 600 мільёнаў еўра:

— Сябрамі „Усходняга партнёрства" з'яўляюцца таксам краіны з-па-за ЕС, такія як Японія і Канада. Беларусь досыць важны атрымальнік гэтага праекта таму, што з'яўляецца краінай адносна вялікай і стабільнай.

Спасылаючыся непасрэдна на дамову аб малым памежным руху з Беларуссю, віцэ-міністр Баркоўскі заявіў:

— Мы вынеслі ініцыятыву, змяняючую еўрасаюзнае распараджэнне, каб абшар малога руху ахопліваў 50 кіламетраў „плюс".

Умовай атрымання адпаведнай пяцігадовай чыпавай карты (20 еўра), якая дае права на свабоднае перасяканне мяжы, з'яўляецца прапіска ў зоне малога руху на працягу прынамсі трох гадоў і неабходнасць актуальнай страхоўкі.

— Не хочам, каб займаліся імі выдуманыя фірмы. Хочам, каб беларускі ўрад рэкамендаваў тыя фірмы і быў адказны за іх верагоднасць. Ва Украіне іх каля 14-15, — адзначыў віцэ-прэм'ер.

Чыпавыя карты будуць выдаваць польскія консульствы ў Брэсце і Гродне, і беларускія ў Беластоку і Белай-Падляшскай. Пры перасяканні мяжы трэба мець з сабою, вядома, таксама і пашпарт.

Падляшскія самаўрадаўцы і бізнесоўцы ў час сустрэчы скардзіліся на неаднойчы благую консульскую абслугу ў польскіх дыпрадстаўніцтвах у Беларусі і валакіту працэдур у выдачы віз.

— У консульстве РБ у Беластоку нас трактуюць элегантна. А ў адным з нашых консульстваў у Беларусі я быў нават сведкам, што адной асобы не хацелі ўпусціць у будынак консульства, — сказаў Лех Пілецкі, старшыня Падляшскага бізнес-клуба.

Ян Баркоўскі адказаў:

— Маем недастатковую колькасць консулаў і клопат з іх акрэдытацыяй. Нашы консульствы абкладзены працай. Хочам быць адкрытымі ў гэтай справе, але не хочам націскаў. Спазненні ў выдачы віз гэта выключэнні. Мусім карыстацца пры іх выдачы правяральнай шэнгенскай інфрамацыйнай сістэмай. Бывае, што некаторыя еўрасаюзныя краіны нам не вераць і яшчэ самі правяраюць паасобныя асобы, якія хадайнічаюць за шэнгенскую візу.

Распытваны „Нівай", пра якія краіны гаворка, віцэ-міністр не адказаў. Прадбачыў кантроль якасці працы ў польскіх консульствах у Беларусі, не выключаючы магчымых кадравых змен:

— У нашых консульствах у сувязі з уступленнем у сілу дамовы аб малым памежным руху плануем павелічэнне занятасці ад трох да пяці асоб. Гэта будуць асобныя акенцы і пункты.

Ва Украіне дамова аб МПР уведзена 1 жніўня. Калі гаворка аб Беларусі, віцэ-міністр прадбачыў:

— Першага студзеня не было б магчымым ажыццявіць нашу дамову. Пасля падпісання мусяць ратыфікаваць яе парламенты. Так што прыйдзецца пачакаць.

Усё паказвае на тое, што дамова пачне дзейнічаць вясной.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Поўны спісак мясцовасцей, якія апынуцца з польскага і беларускага бакоў у абсягу МПР, можна праверыць у нашай рэдакцыі.

XII Агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы

Рэдакцыя „Нівы" і Беларускі саюз Рэспублікі Польшча аб'яўляюць XII Агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы. У конкурсе будуць разглядацца працы грамадзян Польшчы на беларускай мове.

Прынцыпы ўдзельніцтва

1. Конкурс праводзіцца ў дзвюх узроставых групах:

— **I група:** дзеці і моладзь пачатковых школ і гімназій,

— **II група:** астатнія ўдзельнікі (выключна аўтары, якія не з'яўляюцца членамі літаратурных творчых саюзаў).

2. У рамках груп конкурс праводзіцца ў дзвюх катэгорыях: паэзіі і прозы.

3. Конкурсныя працы, набраныя на камп'ютары або разборлівы рукапіс у чатырох экземплярах (паэтычныя творы — 3-5 вершаў, іншыя літаратурныя формы — аб'ёмам да 22 старонак стандартнага машынапісу) трэба падпісаць крыптанімам, пазначыць нумарам узроставай групы і паслаць на адрас: **Redakcja „Niwy", ul. Zamenhofa 27, 15-959 Białystok 2, skr. poczt. 84** з прыпіскай на канверце: XII Ogólnopolski Konkurs Poezji i Prozy Białoruskiej.

4. Прозвішча, імя і дакладны адрас аўтара дасланых конкурсных прац трэба памясціць у асобным заклееным канверце, падпісаным звонку такім нумарам групы і крыптанімам, як і конкурсныя працы.

5. На конкурс трэба дасылаць творы, якія дагэтуль нідзе не друкаваліся і не ўзнагароджваліся на іншых конкурсах.

6. Арганізатары не вяртаюць дасланых твораў.

7. Працы надасланыя аўтарамі ў мінулым годзе пераходзяць у сёлетні конкурс

Тэрміны

1. Тэрмін дасылання конкурсных прац мінае **12 лістапада 2009 г.** (вырашае дата паштовага штампа).

2. Вынікі конкурсу будуць аб'яўлены ў снежні 2009 г.

3. Уручэнне ўзнагарод адбудзецца на адмысловай сустрэчы. Аб тэрміне мерапрыемства лаўрэаты і астатнія ўдзельнікі конкурсу будуць паінфармаваны і запрошаны прыняць у ім удзел.

Конкурс праводзіцца дзякуючы фінансавай падтрымцы Міністра ўнутраных спраў і адміністрацыі.

САРДЭЧНА ЗАПРАШАЕМ!!!

9 770546 196000

Перапіс па-беларуску

Перапіс насельніцтва заўсёды выклікае ў звычайных грамадзян адно пытанне: „Няўжо яны нечага пра мяне яшчэ не ведаюць?" Пры гэтым слова „яны" ўжываецца ў нейкім абстрактным значэнні, бо сказаць дакладна хто гэта такія „яны" ніхто не можа. Зразумела, што гэта не перапісчыкі і нават не зусім прадстаўнікі ўлады. А калі больш дакладна, то не толькі ўлада. Гэта нешта патаемнае і незразумелае, і больш набліжанае да разумення нейкіх містычных паняццяў. Такіх, прыкладам, як сілы зла.

Існая ўлада, у гэтым вызначэнні разумення слова „яны", прысутнічае абавязкова. А як жа без яе? Яна не можа быць адарванай ні ад самой ідэі перапісу, ні ад самога паняцця зло. І ўвогуле, нічога добрага ні ад яе, ні ад таго, што яна робіць, чакаць ніколі не прыходзіцца. Бо яна, улада, для беларуса заўсёды чужая, нават калі і свая.

У беларусаў такое разуменне ўлады ў крыві. І такое застанецца яшчэ доўга, нават калі прыйдзе самая лепшая і самая справядлівейшая ўлада. За апошніх трыста гадоў прадстаўнікі нашай нацыі недзе на генетычным роўні сталі адчуваць, што наша „родная" ўлада — гэта ўлада чужацкая. І ставіцца да яе трэба адпаведна. Таму тайна парушыць загады чужакоў заўсёды лічылася справай гонару. Незалежна ад таго, ці чалавек парушае правілы дарожнага руху і п'яны на знак абмежавання хуткасці „50" едзе колькі можа яго машына, ці на пытанні перапісу наўмысна адказвае няправільна.

Яшчэ на мінулым перапісе насельніцтва ў 1999 годзе незалежныя журналісты абвінавачвалі ўладу ў тым, што яна фальшуе вынікі перапісу. Абвінавачвалі, і правільна рабілі, бо ніхто гэтую ўладу на праўдзівасці яшчэ не злавіў! Ніхто дакументальна не зафіксаваў таго факту, што яна па нейкіх прычынах узяла ды сказала праўду. А як кажа народная, крыху перароблена прымаўка — не злавіў за руку, то і не кажы нічога.

Але гэта не бяда, і нават ніякая не праблема, што ўлада можа сфальшаваць вынікі перапісу. Халера з ёй і з тымі вынікамі. Хай фальшуюць і махлююць колькі ім улезе. Якая розніца якія там вынікі! Не ў тым клопат. Праблема ў тым, што гэтыя вынікі сфальшуе сам народ. І ніколі на пытанні перапісу, у масе сваёй, не адкажа праўдзіва.

Мяркуйце самі. Пытанні пра мову:

„Родная мова (мова, засвоеная першай у раннім дзяцінстве)

На якой мове звычайна размаўляеце дома?"

Адразу бачна, што ўлада вырашыла заблытаць народ. Паняцце „родная" перамешваецца з „засвоеная першай у раннім дзяцінстве". Ці вось гэтае слова „звычайна". „На якой мове звычайна размаўляеце...?" Напрошваецца адказ пытаннем: „А на якой не звычайна?" І становіцца зразумелым, што ўладу абсалютна не цікавіць ні праўдзівы адказ, ні існы стан рэчаў з мовай.

Але і народу не цікавіць праўдзівы адказ. І ён не збіраецца гаварыць праўду. Ён адказвае не так як ёсць, а так як, на яго думку, будзе лепш для яго. Прыклад даў сам галоўны. Ён сказаў, што ў хаце размаўляе па-беларуску, па-руску і на трасянцы. Я налічыў тры назвы. Але перапісчык на вачах гледачоў усёй краіны (гэта трансляваўся па тэлебачанні) сказаў, што галоўны размаўляе на дзвюх мовах, і так запісаў у перапісны ліст.

Ніхто яго не паправіў і нічога не ўдакладніў. А навошта. Народ ведае, што ўлада абвесціць такія вынікі, якія захоча, а ўлада ведае, што народ ёй праўды ніколі не скажа. І сабе не скажа.

І атрымліваецца ўнікальная, парадаксальная і надзвычай камічная сітуацыя, вартая бессмяротнага пяра О'Генры — улада пры жаданні можа не сказаць народу праўдзівых вынікаў перапісу, але народ яшчэ раней не сказаў праўды ўладзе. Такім чынам, яе, маткі праўды, ніхто не даведаецца. Ні народ, ні ўлада. А самая фішка ў тым, што ні народ, ні ўлада, яе, маткі праўды, і ведаць не хочуць.

Таму няма чаго нервавацца, што нехта нешта нафальшывіць, выкарыстае ў сваіх інтарэсах, пераверне, салжэ і пасмяецца. Салгуць усе і ўсе пасмяюцца адзін з другога і самі з сябе. А на другі дзень пасля абвяшчэння вынікаў перапісу літаральна ўсе, на хвілінку, засаромеюць іншых і саміх сябе. Але толькі на хвілінку. А праз хвілінку ўсе забудуцца пра вынікі перапісу і жыццё пойдзе сваім звычайным даперапісаўскім шляхам.

Віктар САЗОНАЎ

Негеройскія прэміі

Пытанне трыццацігадовай даўнасці: чаму маршалу Брэжневу не прысвойваюць звання генералісімуса? Адказ: калі ён вымавіць гэтае слова, то яму прысвояць яшчэ і званне народнага артыста СССР. Прыгадваю гэты анекдот, бо Брэжнеў жывы ў памяці народных мас, а тым, хто пра яго забыў, хачу сёе-тое прыпомніць. У народным гумары захаваў ён славу збіральніка ўсялякіх вышэйшых узнагарод, не беспадстаўна. Вось некаторыя з іх: тройчы герой Балгарыі (1973, 1976 і 1981 гады), тройчы герой ГДР (1976, 1979 і 1981), герой Лаоса (1981), герой Кубы (1981), герой Манголіі (1976), герой працы Манголіі (1981), тройчы герой Чэхаславакіі (1970, 1976, 1981). Яму ў 1973 годзе быў прысвоены польскі ордэн Virtuti Militari першай ступені ды іншыя польскія ўзнагароды. Ён лаўрэат афганскага Сонца свабоды (1981) ды пэруанскага Сонца Пэру (1978); гэтую апошнюю ўзнагароду ён атрымаў роўна трыццаць гадоў раней, чым наш Дональд Туск. У тым жа 1978 годзе Брэжнеў атрымлівае міжнародную Ленінскую прэмію „За мацаванне міру між народамі". Былі спробы вылучэння кандыдатуры такога героя і на Нобелеўскую прэмію міру. А найважнейшыя ж былі савецкія залатыя зоркі героя, у тым ліку чатыры адзнакі Героя Савецкага Саюза, апошнюю з якіх Брэжнеў атрымаў 18 снежня 1981 года; вось яе абгрунтаванне: „за выдающиеся заслуги перед Коммунистической партией и Советским государством в деле укрепления экономического и оборонного могущества Советского Союза, большой личный вклад в достижение победы над немецко-фашистскими захватчиками в годы Великой Отечественной войны, восстановление и дальнейшее развитие народного хозяйства СССР в послевоенный период, неутомимую деятельность в борьбе за мир, за плодотворное руководство коммунистическим строительством и в связи с 75-летием со дня рождения". Гэта было афіцыйнае абгрунтаванне, але тадышнія прапагандысты тлумачылі яшчэ, што ўзнагарода таварышу Брэжневу, гэта ўзнагарода ўсяму савецкаму народу...

Прыпамінаю гэтае былое тлумачэнне дзеля ўсведамлення, што абгрунтаванні ўзнагарод сённяшнім лаўрэатам прымаюцца чыста літаральна. Напрыклад, сёлетняя мірная Нобелеўская прэмія Бараку Абаму была абгрунтавана ягонымі надзвычайнымі намаганнямі дзеля мацавання міжнароднай дыпламатыі і міжнароднага супрацоўніцтва. На вялікі жаль, няма пры нарвежскім Стортынгу змагароў ідэалагічнага фронту, якія б патлумачылі ўсенароддзю, таму міжнароднаму тлуму, масам, што так папраўдзе гэтай прэміяй было ўзнагароджана амерыканскае грамадства — за той выбар, які яно зрабіла амаль год таму, за выбар не абяцаны, але здзейснены. Абама абяцаў больш міру, але гэтага таксама нельга ўспрымаць літаральна, бо не ўсе сусветныя рычагі ў ягоных руках. У свеце ёсць вельмі многа розных герояў, якія трымаюць пальцы на кнопках баявых установак, скіраваных у розных напрамках; як у вядомай байцы Крылова пра лебедзя, шчупака і рака. І дарма спадзявацца, што Амерыка ў прыступе міралюбнасці аддасць свае збыткоўныя ракеты героям Ірана, а антыракеты — героям нашай Найяснейшай.

Выбар амерыканскім грамадствам мірнага напрамку знешняй палітыкі гэта адно. Другой важнай рысай мінулагодняга амерыканскага выбару — па-за зместам прэзідэнцкай праграмы — быў выбар яе носьбіта не абумоўлены ягонымі вонкавымі прыметамі. На галоўную пасаду ў наймагутнейшай дзяржаве свету быў выбраны прадстаўнік меншасці, якой яшчэ пару дзесяткаў гадоў таму тамашнія героі не ўяўлялі бачыць і ў далёкіх подступах да такой пасады. Выглядае, што героі ў амерыканскім грамадстве сталі меншасцю.

Гэта за марамі-акіянамі, а ў нашых царствах-гасударствах, здаецца, героі з меншасцямі не супадаюць. Вось адзін з герояў літаратурнай крытыкі ў найбольш геройскім польскім штодзённіку даў пакурыць Шведскай акадэміі за сёлетнюю літаратурную Нобелеўскую прэмію. Яе лаўрэатка Герта Мюлер выводзіцца з нямецкай меншасці ў Румыніі, а гэта — паводле героя — скандал, бо ж можна было даць тую ўзнагароду нейкаму літаратару з тамашняй большасці. Бо богам у герояў большасць — дастаткова разглянуцца па абезгероеным тутэйшасным тлуме пасля роспуску вялікага Савецкага Саюза...

Вялікія героі часта пабойваюцца іншых вялікіх герояў. Леаніда Брэжнева раз у месяц стрыг ягоны асабісты цырульнік і кожны раз заводзіў гутарку пра абставіны ў Польшчы. Генсек пацікавіўся аднойчы, чаму спецыяліста па ягонай прычосцы цікавіць гэтая тэма. „Мне вас лягчэй стрыгчы, — пачуўся адказ, — калі вам валасы падымаюцца дыбам".

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Вачыма еўрапейца

Непрысутная Беларусь

Час ад часу даходзяць да мяне весткі аб вялікіх беларускіх мерапрыемствах (не маю на думцы беларускай меншасці ў краіне), арганізаваных у Польшчы. Варшава, Познань, Вроцлаў, Гданьск — гэта толькі некаторыя гарады, у якіх можна знаёміцца з культурай Беларусі найвышэйшага і найцікавейшага маштабу. Самае цікавае, што ў такія мерапрыемствы ахвотна ўключаюцца мясцовыя самаўрадавыя ўлады. Беласток у гэтых адносінах — з пункту гледжання якраз самаўрадавых дзеянняў — з'яўляецца пустыняй. Культура Беларусі падчапляецца пад прэзентацыі пад улюбёным нашымі ўладамі лозунгам: шматкультурнасць. Прыкладам гэтаму з'яўляецца перадавая „Падляшская актава культур". Беластоцкія ўлады чысцяць сваё сумленне мерапрыемствамі, рыхтаванымі па інцыятыве (вядома, пры нейкай падтрымцы беластоцкага і падляшскага бюджэтаў) Беларускага грамадска-культурнага таварыства, Беларускага аб'яднання студэнтаў, Звязу беларускай моладзі ці Згуртавання „АБ-БА", на імпрэзах якіх паяўляюцца госці з Беларусі.

Тая праблема, дарэчы, адносіцца не толькі да культуры, але, таксама, напрыклад, да гаспадаркі нашых непасрэдных суседзяў. Я падумаў сабе так некалькі дзён таму ў час чарговага ўжо Эканамічнага форуму „Добрасуседства" ў Седльцах (Мазавецкае ваяводства). Падумаў: чаму тыя, такія важныя для абедзвюх краін сустрэчы прадпрымальнікаў адбываюцца якраз у сталіцы гэтага павета і гміны? Чаму не ў Беластоку, сталіцы ваяводства, павета і гміны, найбольшага горада (метраполіі!), распаложанага найбліжэй польска-беларускай мяжы, з рашуча значна большай традыцыяй гаспадарчага партнёрства з Беларуссю. Дадаткова, чаму на той вучэльні, якая — як аказалася ў час сёлетняга Форуму сарганізаванага ў памяшканнях Сядлецкай акадэміі — не распараджаецца такімі імпазантнымі арганізацыйнымі, лагістычнымі магчымасцямі, як хаця б Універсітэт у Беластоку?

З гэтымі пытаннямі я вярнуўся ў падляшскую сталіцу і зараз жа трапіў на прэс-канферэнцыю лідара рэгіянальнай Грамадзянскай платформы, дэпутата Сейма Роберта Тышкевіча і віцэ-старшыні ГП у рэгіёне, віцэ-прэзідэнта горада Тадэвуша Арлуковіча. Было гэта дзень пасля пабыўкі на краёвым з'ездзе Незалежнага прафсаюза „Салідарнасць" у Беластоку старшыні Еўрапарламента Ежы Бузка.

— Атрымалі мы гарантыю старшыні Бузка, што будзе лабіраваць у Парламенце стварэнне ў Беластоку другога ў Польшчы, пасля Варшавы, бюро ЕП, — з гонарам заявіў дэпутат Тышкевіч.

Гэтае бюро мела б узнікнуць у адным з флігеляў палаца Браніцкіх. Займалася б мінш. дапамогай у хуткай і правільнай падрыхтоўцы самых розных еўрасаюзных праектаў, але і вяло б інфармацыйныя кампаніі (семінары, канферэнцыі, дэбаты і г.д.), звязаныя з дзейнасцю ЕП, між іншым з рэалізацыяй праграмы „Усходняе партнёрства", ахопліваючай таксама супрацоўніцтва з Беларуссю. Спасылаючыся на гэтую праграму, дэпутат Тышкевіч дадаў, што не павінна яна мець толькі дапаможна-гаспадарчага характару, але прымаць пад увагу таксама пытанні звязаныя з захоўваннем стандартаў дэмакратыі і правоў чалавека. Мабыць, бюро ЕП у Беластоку, званае таксама „еўрапейскім домам", зможа ўздзейнічаць на Беларусь, а Беласток, дзякуючы гэтаму, урэшце фактычна стане памостам паміж Польшчай і Беларуссю і шырэй — паміж ЕС і гэтай усходняй суседкай.

Прадвесце магчымага заснавання бюро ЕП у Беластоку, на жаль, не вызваліла мяне ад думкі чаму Беларусь з яе культурай ці гаспадаркай у нашай падляшскай сталіцы практычна не заўважаецца самаўрадавымі, а таксама іншымі ўладамі.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Добрасуседства-2009

Тэкст і фота
Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

Каля двухсот прадпрымальнікаў удзельнічалі ў Эканамічным форуме „Добрасуседства", сарганізаваным Польска-Беларускай ды Беларускай гандлёва-прамысловымі палатамі ў Падляшскай акадэміі ў Седльцах. Удзельнічалі ў ім першы віцэ-прэм'ер Беларусі Уладзімір Сямашка ды віцэ-міністры гэтай краіны — эканомікі Андрэй Тур і замежных спраў — Андрэй Еўдачэнка.

Форум праводзіўся ўжо трынаццаты раз. Сёлета быў ён прыдуманы як памост паміж I Эканамічным самітам Польшча-Беларусь, які адбыўся ў чэрвені ў Варшаве, а II Самітам, планаваным на будучы год у Мінску. Сядлецкім размовам спадарожнічала ідэя, абвешчаная ў час варшаўскага саміта прэм'ерам Дональдам Тускам: „Маўчанне ў нашай сям'і працягваецца задоўга і мы павінны перайсці да новай фазы пабудовы нашых адносін, абапертых на шчырасць і ўзаемную павагу".

Злева: Уладзімір Сямашка, Андрэй Тур, Андрэй Еўдачэнка, Васіль Раманаў, Юзаф Лахоўскі

Двухдзённы форум пачаўся з выступлення першага віцэ-прэм'ера РБ Уладзіміра Сямашкі. Прадставіў ён даныя датычныя двухбаковых гаспадарчых абаротаў, якія ў 2002-2008 гадах — як казаў — павялічыліся ў шэсць разоў, з няпоўных 500 млн. долараў ЗША да 3 мільярдаў долараў ЗША:

— Узрастае лік супольных праектаў. Прыкмячаецца пастаянны рост узаемнага зацікаўлення інвестыцыйнай дзейнасцю. Цяпер у Беларусі дзейнічае больш за 300 кампаній з паём польскага капіталу, а ў Польшчы функцыянуе шэраг беларускіх прадпрыемстваў тавараправоднай сеткі.

Адзначыў:

— Сёлета, ва ўмовах сусветнага крызісу, рэзультаты нашай гандлёва-эканамічнай супольнай дзейнасці больш сціплыя (тавараабарот за студзень-жнівень 2009 г. — каля 1 мільярда долараў ЗША, значыць, менш чым палова ў параўнанні да аналагічнага перыяду 2008 г.).

Віцэ-прэм'ер Сямашка адзначыў м.інш., што рэальныя грашавыя прыходы беларусаў павялічыліся ў параўнанні да мінулага года на 3 працэнты і здолелі ўтрымаць узровень беспрацоўя парадку 1 працэнта. Апрача таго ў першай палове гэтага года, незалежна ад таго — як адзначыў — сусветнага крызісу, беларуская эканоміка была падмацавана замежнымі інвестыцыямі вартымі 4,23 мільярда долараў ЗША, а з іх проста ў бюджэт трапіла 2,48 млрд. дол. ЗША, што складае большую суму, чым за ўвесь мінулы год (агулам у Беларусі дзейнічае каля 4300 прадпрыемстваў з паём замежнага капіталу). Паінфармаваў, што напярэдадні Форуму сустрэўся ў Варшаве з віцэ-прэм'ерам і міністрам эканомікі Вальдэмарам Паўлякам. Як сказаў у Седльцах, канкрэтызавалі яны супрацоўніцтва, звязанае з рэалізацыяй электраэнергетычных праектаў, датычных паставак нафтавых прадуктаў і транзіту газу. Дадаў:

— Улады Беларусі, выкарыстоўваючы сусветны досвед, прыкладваюць максімум высілкаў дзеля лібералізацыі ўмоў вядзення бізнесу.

Адзначыў, што згодна з данымі Сусветнага банка, Беларусь другі год запар апынулася ў першай чацвёрцы краін-лідараў, калі гаварыць аб тэмпах праводжаных эканамічна-гаспадарчых рэформ (прымаліся пад увагу 183 краіны).

Пазітыўна — як сказаў — прынята ў Беларусі сустрэча прэм'ера Сяргея Сідорскага з прэм'ерам Дональдам Тускам пры нагодзе адзначання гадавіны выбуху II сусветнай вайны на Вэстэрплятэ:

— Цяпер чакаем адваротнага візіту польскага прэм'ера ў Беларусь для працягу адкрытага і канструктыўнага дыялогу.

Прадбачыў, што ў лістападзе ў Мінску пройдзе другое пасяджэнне Беларуска-Польскай камісіі па эканамічным супрацоўніцтве. Маюць быць на ім абмеркаваны праблемы, звязаныя з вынікамі ўзнікнення ад 1 студзеня 2010 г. мытнага саюза Беларусі, Расіі і Казахстана, у выніку якога мяжа паміж Польшчай і Беларуссю стане таксама мяжой паміж рынкамі Еўрасаюза і Мытнага саюза гэтых трох краін.

У размове з „Нівай" віцэ-прэм'ер Сямашка, у якога мы спыталіся, што Польшча магла б зрабіць, каб стаць першым гаспадарчым партнёрам Беларусі, а не — як сёння — трэцім, чацвёртым, адказаў:

— Немагчыма, каб Польшча магла перасягнуць гандлёвы абмен Беларусі з Расіяй. Абмен з Расіяй сёлета дасягне 35 млрд. долараў ЗША. Прашу гэтую суму параўнаць з 3 мільярдамі абмену з Польшчай з мінулага года. Расія, хоць бы па прычыне нафты і газу, з'яўляецца нашым галоўным партнёрам. Польшча з'яўляецца фактычна трэцім, чацвёртым партнёрам, таксама пасля Украіны, дзе нашы абароты сягаюць 5 мільярдаў долараў. У размове з прэм'ерам Вальдмарам Паўлякам я сказаў, што маем магчымасць павялічыць гандлёвы абарот з Польшчай у два-тры разы. Мы павінны інтэнсіфікаваць нашы кантакты, а таксама шляхам такіх сустрэч як наш Форум, магчы дастасаваць наш закон так, каб польскі бізнес адчуваў сябе ў нас камфартабельна, каб былі гарантыі аховы чужога капіталу.

Пыталіся мы пра адрозненні ў польскай і беларускай эканоміках. Дадаў:

— Абвінавачваюць нас у тым, што гаспадарка знаходзіцца ў нас у руках дзяржавы. Накіроўваемся да прыватызацыі, але асцярожна. Не можам дазволіць сабе на такую прыватызацыю, якая была ці ёсць у іншых краінах Цэнтральнай Еўропы. Хочам, каб інвестары, таксама польскія, не толькі выкуплялі акцыі, але таксам мелі грошы на інвестыцыі ў нас на чарговыя гады.

Гражына Гэнцлеўская, віцэ-міністр эканомікі, у сваім выступленні адзначыла, што Польшча ўспрымае з задавальненнем заканадаўчыя змены, якія лібералізуюць доступ да беларускага рынку:

— Мы пастаянна выказваемся за павелічэнне дынамікі працэсу ўваходу Беларусі ў Сусветную арганізацыю гандлю (...). Сітуацыя ў Беларусі дае падставы для аптымізму.

Ад імя ўрада задэкларавала эксперцкую дапамогу ў беларускіх прыватызацыйных працэсах і развіццё рынкавых інвестыцый (напр., праз Сусветнае агенцтва замежных інвестыцый).

Віцэ-міністр Андрэй Еўдачэнка, які займаецца ў ведамстве замежных спраў Беларусі пытаннямі гандлю і эканомікі, адзначыў, што на практыцы мытны саюз Беларусі, Расіі і Казахстана будзе ўводжаны паэтапна да чэрвеня 2011 года, хоць новыя мытныя стаўкі будуць абавязваць ад 1 студзеня будучага года. Наконт цяперашніх мытных ставак для Польшчы нямнога зменіцца ў Беларусі. З 12-13 тысяч пазіцый, у больш за 8 тысячах не зменяцца, а ў выпадку 2300 будуць паменшаны, між іншым на гатовыя тэкстыльныя вырабы. „Ніве" віцэ-міністр Еўдачэнка расказаў аб шанцах уступлення Беларусі ў Сусветную арганізацыю гандлю (WTO):

— Сёння цяжка гаварыць пра індывідуальны ўваход Беларусі, Расіі ці Казахстана. 9 чэрвеня на ўзроўні галоў дзяржаў прынялі мы рашэнне аб супольным уваходзе. Вядуцца ў гэтай справе размовы ў сядзібе WTO ў Жэневе. Для нас цяпер гэта не найважнейшая праблема. Цяпер найважнейшае — абмеркаванне з нашымі гандлёвымі партнёрамі спраў звязаных з гандлёвым рэжымам, які будзе абавязваць ад 1 студзеня ў сувязі з нашым Мытным саюзам.

І дадаў:

— У сувязі з ёю польскія прадпрымальнікі будуць мець дадатковыя прывілегіі, паколькі ў шмат якіх выпадках паніжаем мытныя аплаты. Апрача таго кожны тавар, які перасячэ мытную мяжу з Беларуссю, зможа свабодна кружыць па краінах цэлага нашага мытнага саюза, так як гэта ёсць у Еўрасаюзе.

У сваю чаргу Ірына Луферчык з Міністэрства падаткаў і аплат РБ запэўнівала ў размове з „Нівай":

— Калі польскі прадпрымальнік схоча заснаваць фірму ў Беларусі, можа плаціць такія падаткавыя стаўкі і карыстацца такімі льготамі як і беларускія прадпрымальнікі. Могуць карыстацца спрошчанай сістэмай, нават толькі з адным падаткам, хоць бы толькі экалагічным, за час усяе дзейнасці. Прапануем шэраг ільгот.

У час Форуму ў Седльцах праводзіліся семінары датычныя трансгранічнага супрацоўніцтва, доступу да беларускага рынку і прыватызацыі. Ставіліся пытанні дастасавання беларускіх і еўрасаюзных нормаў і сертыфікатаў. Заклікалі за аптымалізацыю часу кантролю тавараў на мяжы. У час адной з публічных дыскусій аказалася — як заявіў віцэ-міністр Еўдачэнка — што пасля ўзнікнення мытнага саюза будзе магчымы супольны польска-беларускі мытны кантроль так, як ёсць і цяпер, ад часу ўваходу Польшчы ў ЕС. Важным пытаннем аказалася плацежаздольнасць беларускіх партнёраў. Тамаш Срачынскі, старшыня Карпарацыі страховак экспартных крэдытаў, падобна як і польскія прадпрымальнікі, звярнуў увагу:

— Без належнай увагі трактуем тэму забеспячэння прадпрымальнікаў і іх тавару ад недахопу плацежнасці з боку беларускага атрымальніка. Датычыць гэта так унутранага рынку, як і экспарту, так спажывецкіх тавараў, як і інвестыцыйных. Гэта асноўная апаска прадпрымальнікаў перад падпісаннем кантракта. І гэта асноўная патрэба, каб гандаль мог развівацца. Абавязкам дзяржавы, а не толькі страхавых фірм, з'яўляецца гарантыя, каб тавараабмен быў ахоўваны так, як гэта адбываецца ў энергетычнай прамысловасці ці пры вялікіх інвестыцыях.

Беларускі бок заклікаўся таксама да папярэдняга інфармавання аб уводжанні часовых мыт і імпартных квот.

— Пасля ўвядзення мытнага саюза часовыя мыты будуць адменены, — адказаў віцэ-міністр Еўдачэнка.

— На жаль, у Беларусі нельга прымяняць папярэдняй аплаты, — скардзіліся бізнесмены. — Спісак тавараў на беларускі рынак павінен быць вядомы ўвесь год, а не што і раз мяняцца.

Выносіліся патрабаванні спрашчэння працэдуры выдачы віз для прадпрымальнікаў, даўжэйшых тэрмінаў іх сапраўднасці і падпісання міжурадавай дамовы аб гандлёвай міграцыі паміж Польшчай і Беларуссю. Васіль Раманаў, старшыня Беларускай прамыслова-гандлёвай палаты і Юзаф Лахоўскі, старшыня Польска-Беларускай гандлёва-прамысловай палаты былі згодны, што ў будучым годзе варта спалучыць у Мінску Эканамічны саміт з Форумам „Добрасуседства".

Нараўчанская гміна

Па дарозе ў Сушчы Барок

Праз тэрыторыю Нараўчанскай гміны пралягае некалькі павятовых дарог і амаль усе яны маюць асфальтавыя маставыя. Адна не мае асфальтавага палатна. Вядзе яна з Нараўкі ў Падляўкова цераз Мінкоўку і Сушчы Барок. Дзіўная гэта гравейка: некаторыя яе адрэзкі маюць 5 метраў шырыні, а іншыя ўсяго 3 метры! І як на такім вузкім адрэзку размінуцца аўтамабілям? Ехаў сюдою лістаноша з Нараўкі і толькі хіба цуд здарыўся, што абодва вадзіцелі не разбілі сваіх самаходаў. Гэты ж пісьманосец прасіў мяне агледзець гэтую павятовую, што ні кажы, дарогу і „добра яе апісаць". Ён ужо баіцца сюдою ехаць!

У Сушчым Барку яшчэ апрача таго ёсць крутыя і зарослыя густой травой ды высокім пустазеллем павароты.

2 кастрычніка г.г. ехаў я гэтай дарогай з Падляўкова ў Сушчы Барок. У лесе (а ён ад вёскі да другой вёскі) на жвіроўцы г.зв. валкаўніца або, як хто хоча, хвалі, якія гоніць вецер на вадзе. Калі хто едзе роварам як я, дык кідае ў дрыготку. Да таго ў двух-трох месцах парабіліся шматлікія глыбокія ўхабіны-ямы. Пасля дажджу яны поўныя вады. Увогуле маставая раз'езджаная, няроўная і вузкая, а ўжо асабліва перад пераездам праз чыгуначныя пуці. Аб тым, што даязджаем да пераезду, павінны інфармаваць дарожныя знакі. Яны ёсць, але схаваныя ў кустоўі, што расце на абочынах дарогі.

Неабходна пусціць на гэтую дарогу грэйдар і зрабіць парадак. Найлепш было б, калі б паспелі перад маразамі. А зіма не за гарамі!

(яц)

Што хутка робіцца....

Грамадскасць Чаромхаўскай гміны часта скардзілася на частыя выключэнні электраэнергіі. Радныя ставілі праблему на сесіі Рады гміны. У выніку ў красавіку праводзілася мадэрнізацыя электрычнай лініі. Выканаўца, а была ім варшаўская фірма, хутка справілася з задачай і я ў сваім допісе паставіў работнікаў у прыклад. А народная мудрасць кажа: „Не хвалі пагоды з ранку...". Аказваецца, гэта праўда. Зараз выяўляецца, што пасля мадэрнізацыі надалей здараюцца выключэнні, хоць гэта не мае нічога супольнага з надвор'ем (не было ні буры, ні грому!). У нядзелю кузаўцы (ды не толькі яны) перажылі сапраўдны кашмар. Пасля абеду, у 14:20, раптам патухла святло. Праз некалькі мінут паказалася зноў. Так было разпораз. Канчаткова перапынак доўжыўся да 17 гадзіны. Аднак „Тэлеэкспрэс" не далі паглядзець. Зноў прапаў электраток. Гульня ў жмуркі працягвалася да вечара. Недзе каля сёмай вечара лямпачкі загарэліся. І каго, даражэнькія, вінаваціць? Падыходзіць тут народная мудрасць: „Што хутка робіцца, дык сляпое родзіцца". Так яно і ёсць.

Паколькі ў гміну паступілі чарговыя скаргі, самаўрадаўцы звярнуліся да выканаўцы, каб у рамках гарантыі фірма выправіла загану.

Уладзімір СІДАРУК

З ветрам па Арлянскай гміне

Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

Мікалай Лемеш

— Можа і ў мяне паставяць гэты вятрак... — дзеліцца думкамі адзін з жыхароў Орлі. — У мяне на агародзе цэлае жыццё так дуе. Можа ўрэшце ад гэтага карысць будзе.

На жаль, не ўсе скарыстаюць. Гэты жыхар, здаецца, таксама не, бо спісак гаспадароў, якія на сваіх палях, побач аўса ці кукурузы, вырасцяць ветракі, ужо вядомы. Каб скарыстаць на арэндзе поля пад ветравую электрастанцыю, трэба мець шмат гектараў, на якіх, прынамсі каля кіламетра за вёскай, вырастуць новыя элементы краявіду. Такім чынам ветравая энергія будзе прадукавацца на палях зямельных магнатаў.

— Кожны хацеў бы зарабіць на такой арэндзе, — аддалася марам мая субяседніца, якая прыпынілася ля ўваходу ў гмінную ўправу. — Каму паставяць на полі такі вятрак, то яму добра будзе, бо грошы ад гэтага будуць. А нам? Не ведаю, ці будзе лепш ці горш. Электраток дарагі, я ў месяц плачу 147 злотых, і не веру, што кошт панізіцца, хіба што вырасце. Найлепш, каб паставілі па адным кожнаму, хто мае там з пару гектараў, 10-20, сялянам, інакш будзе крыўдна.

І я ў пэўны момант сама стала марыць. Каб мець гаспадарку на арлянскай зямлі... каб мець вялікія гектары... каб мець такое шчасце... Аднак хутка я вярнулася з гэтых сонных мрояў, калі задула так, што мне адышла ахвота шпацыраваць па вуліцах Орлі. Праўда, тут нейкі іншы вецер, мацнейшы, канкрэтны, раздражняльны нават.

Залаты вецер

— Усе наракалі, што новы войт малады. Малады, малады, але затое пачалося штосьці дзеяцца. Гляньце, штосьці робіць, — каментуе жыхар, які праз арлянскі, „грашадайны" вецер звычайна прабіваецца на сваім ровары. — І тая ІКЕА, і ветракі. Праца людзям будзе.

Адным праца, а другім звычайны фарт. Прыйшлі нейкія людзі, падпісалі дамовы і будуць плаціць грошы.

— У мяне мае быць пяць штук, — прызнаецца спадар Мікалай Лемеш. — Вялікі гаспадар, то прыехалі і спыталі. А чаму не згадзіцца. Тым больш, што грошы плацяць.

— А Орля скарыстае на гэтым? — пытаю з дзіцячай цікавасцю. — Можна будзе карыстацца гэтай энергіяй? Людзі наракаюць на кошт.

— Не, усё паступае ў прадпрыемства энергетыкі і яны размяркоўваюць электраэнергію. Нават як пабудуеш сабе малую энергастанцыю, тады нават лішак энергіі мусіш аддаць прадпрыемству. Такі закон, што суседу нельга прадаць. Тут у нас няма ніякіх электрастанцый паблізу, то карысцю будуць, мабыць, малыя страты ў перасыланні.

Спадар Лемеш, як спецыяліст па энергетыцы, тлумачыць усе складанасці справы. Цешыцца, што яму ўдасца таксама падзарабіць.

— Мы тут з сынам і сям'ёй толькі працуем. Абрабляем пару соцень гектараў. Гэта шмат працы, але не наракаем. Не баяліся крэдытаў і інвестыцый ды таму і зараз гэта нам аплацілася.

Турбіны ветракоў стануць таксама на іншых палях, дзе развіваюцца найбольшыя гаспадаркі ў ваколіцы, так як ва Уладзіміра Добаша ў Сельскагаспадарчым прадукцыйным прадпрыемстве каля Крывятыч.

— Не шкада зямлі? — пытаю.

— А чаму ж? За 25 тысяч злотых у год? За кожны вятрак атрымаем 25 тысяч, а займае ён 0,25 га. Як у мяне стануць чатыры ветракі, то гэта дасць 100 тысяч, а гэта 250 тон пшаніцы! — цешыцца спадар Добаш. — Колькі на гэта трэба працаваць, а тут дарма такія „левыя" грошы. Вельмі цешуся.

— Не будзе ніякага гоману, ніякіх мінусаў?

— Цяжка сказаць. Як будзе, то пабачым у 2014 годзе, калі праўдападобна ветракі стануць і пачнуць працаваць.

— А людзі як да іх ставяцца?

— Ну, напэўна зайздросцяць. Разумею тое. Гэта ж грошы атрыманыя дарма. Вельмі нам дапамогуць.

Альтэрнатыва?

Гляджу на вялікі сельскагаспадарчы камбінат спадара Лемеша і думаю сабе, што трэба вялікай рашучасці, каб працаваць на такой вялікай гаспадарцы.

— Гэта самая вялікая гаспадарка ў ваколіцы, — нясмела ганарыцца сваім дасягненнем „шэф". — Вядома, што калі ёсць план нейкай інвестыцыі, тады прыйдуць да гэтых найбольшых, наймацнейшых. Лічаць нас людзьмі адказнымі і адкрытымі на новае. Мяне намаўлялі таксама да вырошчвання кукурузы, сто гектараў, для прадукцыі біягазу, бо тут таксама хочуць прадукаваць энергію і ў такі спосаб.

— Пагадзіліся?

— Не, трэба было б купляць сілаасуборачную машыну, а мне ў такі няпэўны час не хочацца рызыкаваць і „пераўтварацца".

Нягледзячы на вецер хаджу надалей па Орлі, шукаючы плюсаў і мінусаў новых праектаў. Некаторыя са здзіўленнем кажуць, што пра ветракі не чулі, іншыя ў адказ кідаюць, што ў іх шмат сваёй працы і чужой не цікавяцца. З сінагогі выходзяць людзі. Прыпыніліся на рагу вуліцы, я разам з імі.

— Прошэ пані, ніхто пра тое не гаворыць, але тыя ветракі не зусім такія бяспечныя, — з лёгкай пафаснасцю ў голасе гавораць турысты з-пад Варшавы. — Па-першае, увогуле не разумеем чаму нехта хоча закінуць смецем так цудоўны падляшскі краявід! Але ў чым сутнасць? Ветракі ствараюць інфрагукі. Іх, зразумела, не пачуем, але адмоўна ўплываюць яны на людскія вены. Разбурае чалавека ад сярэдзіны. Чаму мы капіруем узоры з Захаду, калі тэхналагічнае развіццё пайшло наперад, а мы крок за крокам і ўвесь час ззаду. Не час на ветракі, а на прадукцыю біягазу! Гэта пакуль што самы лепшы выхад для вытворчасці энергіі ды яшчэ самы бяспечны.

— А можна спытаць адкуль у вас такія веды?

— Я проста цікаўлюся тым, што адмоўна і карысна ўплывае на маё здароўе і жыццё.

З пункту гледжання гміны і яе жыхароў ветракі, здаецца, нясуць самыя карысці. Пра нейкія адмоўныя рысы гэтай інвестыцыі ніхто не гаворыць і ніхто нават не думае.

— Карысці для гміны? — рытарычна пытаецца войт гміны Орля Пётр Сельвэсюк. — Там, дзе будуць пабудаваны ветравыя турбіны, будуць таксама добрай якасці дарогі. А другая карысць — гэта грошы для гміны. Гэта двухпрацэнтны падатак ад будоўлі. Калі ў сярэднім палічыць, атрымаецца каля аднаго мільёна злотых дадатковых грошай у нашу касу і гэта будзе прыбытак, які выкарыстаць можам у любы спосаб, значыцца, у адпаведнасці з законамі, але не так як у выпадку мэтавых датацый ці грантаў.

Як падкрэслівае прадпрымальны войт, ён заўсёды марыў, каб у Орлю прыходзіла новае, каб гміна не стаяла ў месцы:

— Дарогі будуе кожны, але ветракі, якія, дарэчы, ужо стаяць на Сувальшчыне, ці фабрыку ІКЕА — не. Дык чаму не ў нас. Аказалася, што тут спрыяльныя ўмовы, адпаведныя вятры, іх моц, накірунак. Тое, што на нашай тэрыторыі стане 15 ветракоў, пэўна самы лепшы варыянт паводле аналізаў, лакалізацыя мінімум 0,5 — 1 км ад вёсак, а гудзець будуць напэўна ў межах нормаў, якія ў нас зараз вельмі патрабавальныя. Не баюся гэтых інвестыцый, бо ўсё пойдзе ў карысць усяе гміны.

* * *

— Ездзіў я неаднойчы па Нямеччыне, — падводзіць справу Мікалай Лемеш. — Там стаяць сотні такіх турбін. Ім не перашкаджаюць, не шкодзяць, значыць, і нам не будуць.

Пару гадоў пройдзе, пакуль арлянскі краявід стане „энергетычным" і прамысловым. Ці гэта сапраўды адмоўна на яго паўплывае? А можа грошы, якія трапяць у гмінную касу, дазволяць кіраваць гмінай намнога больш эфектыўна — гмінай, людзьмі, прыродай. Пытанні адкрытыя, але не так зусім неабгрунтаваныя.

Як павялічыцца ахова?

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Жыхары, а перш за ўсё радныя Нараўчанскай гміны, так як і суседняй Белавежскай, жывуць яшчэ прапановай пашырэння Белавежскага нацыянальнага парку і разважаюць, як тут быць, а тут даведаліся пра новую ідэю Міністэрства асяроддзя, якая прадбачвае заўважальнае пашырэнне ў іх гмінах тэрыторый аховы, ахопленых праграмай „Натура 2000". Радным трэба будзе даць згоду або не на прапанову пашырэння парку і выказацца наконт ідэі павелічэння тэрыторый „Натура 2000", якая нясе з сабою большыя абмежаванні ў галіне будаўніцтва, аховы асяроддзя і гаспадарчай дзейнасці. Дзеля пабольшання тэрыторый аховы „Натура 2000" не трэба згоды мясцовага самаўрада, а толькі патрэбная ацэнка прапановы мясцовымі раднымі.

Зараз і так 80% Нараўчанскай гміны ахоўваецца ў рамках еўрапейскай праграмы „Натура 2000", у птушынай і расліннай дырэктывах. Аднак генеральны дырэктар аховы асяроддзя прыслаў у Нараўку праект пастановы аб пашырэнні тэрыторый „Натура 2000".

— Згодна з праектам мелі б быць пашыраны тэрыторыі гэтай асаблівай аховы ў даліне верхняй Нарвы на раён Ляўкова і вадасховішча „Семяноўка". „Натура 2000" пры вадасховішчы „Семяноўка" гэта недаразуменне. У пэўных месцах межы гэтай аховы праходзяць па вадасховішчы, якое не з'яўляецца натуральным, а „Натура 2000" мае ахоўваць натуральныя вартасці, а не штучныя, — заяўляе войт Нараўчанскай гміны Мікола Павільч. — Змены дасланага праекта „Натура 2000" могуць адбыцца толькі з-за навуковых фактараў. Грамадскія, эканамічныя ці гаспадарчыя прычыны не бяруцца пад увагу і таму мы рашыліся самі заказаць прыродазнаўчую інвентарызацыю гэтых тэрыторый. На падставе яе відаць, што вартасныя ў еўрапейскіх умовах жытлы зараз здэфармаваныя. У рапарце гаворыцца таксама аб некалькіх гектарах лугоў з ятрышнікам. Аднак месца гэтае згодна з нашымі планамі мае быць прызначанае пад гольфавае поле і няма пагрозы, што гэтая тэрыторыя будзе знішчана.

Тэрыторыі каля Ляўкова, прызначаныя пад ахову „Натура 2000", не спыняць дзейнасці прадпрыемства Будаўнічая кераміка „Ляўкова". Будзе яно надалей здабываць гліну і арганізаваць сваю прадукцыю. Аднак у Нараўчанскай гміне апасаюцца, ці гэтая асаблівая ахова ў наваколлі Ляўкова не перашкодзіць у будове і перабудове дарог, а таксама ў пракладцы каналізацыі ці водаправодаў.

— Бяда нам з гэтай „Натурай 2000", бо калі пабольшаюць яе тэрыторыю, можа спыніцца развіццё турызму ў наваколлі Семяноўскага вадасховішча. Мяжа новага праекта „Натуры" праходзіць у Ляўкове зараз за нашымі клунямі, а тут і далей ад нашай вёскі ёсць толькі ворыва, а няма нават лугоў. Людзі здаўна аралі тут, сеялі, а зараз знайшлі нейкую расліннасць для аховы. Якая ж тут можа быць расліннасць для аховы? Далей, каля Навін ёсць сасновы лес і ў напрамку Новай Лукі і Міхнаўкі ёсць ужо нейкая расліннасць на падмоклых тэрыторыях, — кажа нараўчанскі радны з Ляўкова Ян Целушэцкі. — Добра, што навукоўцы зрабілі экспертызы, бо на тэрыторыях прапанаваных да новай аховы „Натурай 2000" знайшлі мала расліннасці, якую трэба было б спецыяльна ахоўваць.

Дарога з Гайнаўкі ў Нараўку, што праходзіць праз Белавежскую пушчу, знаходзіцца якраз на тэрыторыі аховы „Натура 2000". Была яна між іншым важнай прычынай для спынення вялікай нафтавай інвестыцыі канцэрна „Лукойл" у Нараўчанскай гміне, бо мелі б вазіцца па ёй небяспечнае для асяроддзя паліва, якое не павінна транспартавацца па тэрыторыі „Натура 2000"

Нараўчанскі войт і радныя якраз найбольш апасаюцца пабольшання тэрыторый „Натуры 2000" каля вадасховішча „Семяноўка". Для іх зроблены ўжо планы добраўпарадкавання, прадбачваецца развіццё турызму. Сем гектараў адведзена там на гмінную інвестыцыю, якая рэалізуецца з вялікім махам. Да вадасховішча каля Старога Двара нядаўна даведзены былі шыкарная асфальтавая дарога даўжынёй пад 3 кіламетры, водаправод і каналізацыя. Будуецца там амфітэатр на тысячу глядзельных месц, санітарныя будынкі, мае ўзнікнуць вялікі пляж і гольфавая пляцоўка. Будзе там таксама месца на прыватныя гастранамічныя паслугі і начлежную базу. На інвестыцыю гмінныя ўлады атрымалі дафінансаванне з еўрасаюзных фондаў, але мусяць таксама дакласці свае грошы. Нядаўна радныя дазволілі ўзяць крэдыт размерам звыш 1,3 мільёна злотых на завяршэнне інвестыцыі. Разам з гміннымі інвестыцыямі вельмі хутка падаражалі сельскагаспадарчыя землі непадалёк ад гэтага месца, бо людзі спадзяюцца, што паявіцца там больш інвестараў. Цяжка зараз нешта раіць людзям, што маюць там землі, але можна ўжо і цяпер спаткаць асобы, якія стараюцца купіць большыя арэалы зямлі, якія можна будзе адпрадаць у будучыні для большых інвестараў.

— На шашы ў напрамку Старога Двара, дзе знаходзяцца нашы гмінныя інвестыцыі, можна ўбачыць многа машын, якія вязуць на вадасховішча лодкі. Хаця апошнім часам пахаладнела, рух там вялікі. Некаторыя вадзіцелі думаюць нават, што гэтая шыкарная дарога вядзе ў напрамку Беластока, — заўважыў радны Ян Целушэцкі.

Нараўчанская гміна заінвеставала каля вадасховішча многа сродкаў і спадзяецца, што гэтыя тэрыторыі стануць рухавіком турыстычнага развіцця гміны.

— Калі б тэрыторыі каля вадасховішча „Семяноўка" ўвайшлі ў склад аховы „Натура 2000", то ўсе асобы, якія купілі тут дзялянкі і хочуць інвеставаць, а таксама новыя пакупнікі мусілі б прайсці складаную працэдуру, каб атрымаць дазвол на будову. Трэба тады састаўляць рапарты ўздзеяння будаўнічых інвестыцый на асяроддзе і можа быць так, што нехта не атрымае дазволу на будову, — лічыць войт Мікола Павільч.

Некаторыя жыхары Нараўчанскай гміны звяртаюць увагу, што інвестыцыйныя планы канцэрна „Лукойл" былі спынены якраз з-за боязі перад строгай аховай у наваколлі пушчы. Маглі спалохаць інвестара эколагі і масмедыі, якія выклікалі ажыятаж вакол небяспекі транспарту паліва праз тэрыторыі аховы „Натура 2000".

— Мы выслалі да міністра асяроддзя ліст з просьбай перагледзець ці праект павелічэння тэрыторый „Натура 2000" згодны з працэдурамі такога дзеяння, — паведаміў войт Мікола Павільч. У Нараўчанскай гміне лічаць, што пасля дэталёвай прыродазнаўчай інвентарызацыі, зробленай на ўсіх тэрыторыях прадбачваных да пабольшання аховы ў рамках „Натуры 2000", будуць заўважаны недахопы ў дасланым у Нараўку праекце і можа ў Міністэрстве асяроддзя рашацца на паменшанне тэрыторый новай аховы. Зараз невядома таксама як закончацца размовы ў справе прапанаванага пашырэння тэрыторыі Белавежскага нацыянальнага парку. Улады Нараўчанскай гміны прапануюць павелічэнне тэрыторыі парку ў іх гміне меншае, чым хацела б Міністэрства асяроддзя і патрабуюць больш гарантый на атрыманне сродкаў на развіццё рэгіёна. Цяпер у дзвюх камісіях разглядаюцца пытанні наконт тэрыторый, на якія ў Нараўчанскай і іншых гмінах мае быць пашыраны парк і наконт іншых сродкаў па-за абяцанымі міністрам асяроддзя Мацеем Навіцкім і гарантый іх атрымання. Хутчэй за ўсё тэрыторыі больш строгай аховы асяроддзя ў Нараўчанскай гміне будуць пабольшаны. Можам толькі паставіць пытанне, ці будзе пабольшаны парк, ці „Натура 2000", а можа ў Дзяржаўных лясах узнікнуць новыя запаведнікі? Могуць быць прыняты таксама дзве прапановы адначасова.

„Бацькаўшчына" заклікае парламент прыняць закон аб беларусах замежжа

На падставе рашэнняў нядаўняга Пятага з'езда беларусаў свету МГА ЗБС „Бацькаўшчына" звярнулася да Палаты Прадстаўнікоў з тым, каб была ўзноўлена праца па распрацоўцы праекта закону, які б рэгуляваў стасункі Рэспублікі Беларусь з беларусамі замежжа. Таксама ў лісце рэкамендуецца пры распрацоўцы законапраекта прыняць за аснову прапановы і заўвагі МГА ЗБС „Бацькаўшчына", у тым ліку праект закону „Аб беларусах замежжа", прынятыя на Пятым з'ездзе беларусаў свету.

Пытанне юрыдычнага ўрэгулявання стасункаў беларускай дзяржавы з беларусамі замежжа „Бацькаўшчына" не ўпершыню па даручэнні суполак беларускай дыяспары ўздымае перад дзяржаўнымі органамі. Нагадаем, што ў 2001 годзе Нацыянальны цэнтр законапраектнай дзейнасці пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь па даручэнні кіраўніка дзяржавы пачаў распрацоўку праекта Закону Рэспублікі Беларусь „Аб суайчыннікаў, якія пражываюць за мяжой". У тым жа годзе МГА ЗБС „Бацькаўшчына" брала ўдзел у працы Рабочай групы пры згаданым Нацыянальным цэнтры і выйшла з шэрагам прынцыповых заўваг і прапановаў, якія грунтаваліся на пажаданнях беларускіх суполак замежжа. На жаль, Цэнтр законапраектнай дзейнасці спыніў працу над праектам закону, і яго разгляд, запланаваны на восень 2002 года, не адбыўся. З просьбай паскорыць прыняцце закону звярталіся да Урада і Нацыянальнага сходу ўдзельнікі Чацвёртага і Пятага з'ездаў беларусаў свету (2005, 2009 г.), але таксама безвынікова.

Такім чынам, на сённяшні дзень згаданы закон так і не прыняты. У той жа час, беларуская дыяспара — гэта велізарны нацыянальны рэсурс, які можа стаць важным фактарам эканамічнага і духоўнага ўздыму Беларусі, спрыяць росту міжнароднага аўтарытэту і павышэнню прэстыжу нашай краіны ў свеце. І каб гэта адбылося, нельга працаваць кропкава, выбарачна. Неабходна мэтаскіраваная паслядоўная праца.

Старшыня Рады МГА ЗБС „Бацькаўшчына" Ніна Шыдлоўская адзначыла: „Згаданы вышэй зварот, накіраваны „Бацькаўшчынай" у Палату Прадстаўнікоў, ёсць яшчэ адной спробай звярнуць увагу дзяржавы на найбагацейшы патэнцыял беларускай дыяспары, невыкарыстанне якога прыносіць вялікія страты дзяржаўным інтарэсам Рэспублікі Беларусь і ўсёй беларускай нацыі. Ці будзе гэтая спроба паспяховай? Час пакажа. Са свайго боку „Бацькаўшчына" гатова наладзіць шырокае абмеркаванне праекта закону (ці яго канцэпцыі) у суполках беларусаў замежжа, а таксама вылучыць сваіх прадстаўнікоў у склад рабочай групы ці камісіі па распрацоўцы праекта закону аб беларусах замежжа".

Інфармацыйны цэнтр МГА ЗБС „Бацькаўшчына"

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Смяшынкі Юлькі

— А як сказаць па-беларуску што запрацаваўся? Ну, такі стомлены, што ні рукой, ні нагой не можаш рушыць, — спытала Юлька ў настаўніцы. Жанчына здзівілася. У апошні час яна мала дзе сустракала запрацаваных вучняў. А тут такое пытанне.

— Ёсць такая ў нас прыказка, — настаўніца павярнула ў бок фальклору. На ўроках якраз гаварылі пра прыказкі і прымаўкі. — Калі хто ўжо ў нас быў такі стомлены, то людзі казалі: што ён нарабіўся як конь!

— А можаце прынесці мне гэтую прыказку? — папрасіла Юлька.

* * *

— Ну, гэты Ян Ракета то *з крэтэсам* праваліўся ў сваім Кракаве, — пракаментаваў вынікі выбараў у парламент бацька.

— Тата, — спытала яго Юлька, — а з якой партыі быў Крэтэс?!

* * *

На ўроку Божага закону Юлька спытала ў настаўніка:

— А ці можам мы цалаваць усе іконы?

— Вядома, — адказаў настаўнік, — можам, на тое яны і іконы, каб іх цалаваць.

— А калі хто пацалуе ікону „Апошняя вячэра”? — цягнула малая.

— Ды хай пацалуе, — адобрыў задуму катэхет.

— А калі нехта пацалуе Юду?

ЗОРКА

Фота Ганны Кандрацюк

Патрыцыя і Мішка Ігнацюкі з Зубава

Відава

Выязджаючы з Бельска ў напрамку вёскі Агароднікі, пераедзем праз вёску Відава, якая з'яўляецца амаль ужо часткай горада.

Першыя звесткі пра вёску паходзяць з 1501 года. Менавіта тады, у сілу каралеўскага акта, выдадзенага Аляксандрам Ягелончыкам, бельскі войт атрымаў у пажыццёвае валоданне Відаўшчыну і Завідаўшчыну. Гаворка тут пра ўрочышча, якое знаходзіцца за сённяшнім Відавам, налева ад дарогі Відава — Агароднікі. Варта падкрэсліць, што Відава было мяшчанскай вёскай.

Пасля 1615 года ўрочышча прыняло назву Любмаеравізна — ад свайго гаспадара Яна Любмаера. Маёмасць на працягу стагоддзяў пераходзіла з рук у рукі. Бурлівую гісторыю яго ўладальнікаў адлюстроўвае справа Анастасіі Казлоўскай — працаўніцы бельскай пошты, якая валодала маёмасцю ў першай палове XIX ст. Арганізавала яна сумесна з сынамі наезд на Відава, забіраючы жыхарам каштоўныя ім сукно і кажухі. Сёння даўнюю Любмаеравізну жыхары называюць Грабінай.

У 1855 г. у вёсцы панавала эпідэмія халеры, якую па сённяшні дзень жыхары памятаюць як мор. Паводле легенды, каб стрымаць эпідэмію, мужчыны на працягу сутак мусілі паставіць чатыры крыжы, а жанчыны выткаць такую ж колькасць ручнікоў, каб можна было ў іх занесці гэтыя крыжы. Крыжы расставілі ў чатырох канцах вёскі, а ўсю вёску абаралі чатырма цялятамі.

Іншае паданне пра Відава гаворыць, што на вёску ўпаў вялізны град. Пабіў ён і спустошыў усё — ад жывёлы па забудовы. Гэтай падзеі адведзены трэці дзень пасля Вялікадня, званы мясцовымі „градавой серадой”.

На працягу большай часткі сваёй гісторыі Відава было звязанае з бельскімі цэрквамі: Свята-Міхайлаўскай і Свята-Мікалаеўскім манастыром. Пасля II сусветнай вайны Відава перайшло ў парафію Нараджэння Прачыстай Дзевы Марыі. Зараз існуе тут уласная парафія.

У 2001 годзе ў мясцовай царкве пасвяцілі мемарыяльную дошку з выпадку пяцісотай гадавіны першай пісьмовай звесткі аб Відаве. У вёсцы знаходзіцца шмат цікавых аб'ектаў, м. інш. найстарэйшы дом з 1889 года.

Міхась СЦЕПАНЮК

Міра ЛУКША

Мішка і мушка

Села мішку мушка
на лоб,
на вушка...
Мішка
па вушку:
„Хлоп!”
Мішку
ў вушку
гудзе.
А тая мушка —
дзе?
Мушка
свой гул вядзе
мішку
на барадзе.
Мішка
мушцы —
у вушка!
Вось так ёй даў!
Аж сам упаў!

Яўген Баравы

Лялька

Мама вядзе Таню з дзіцячага садка. На сцяжынцы валяецца лялька — голая, з адарванай рукой. Хлапчук, які прабягаў міма, ударыў ляльку нагой. Яна ўпала на спіну і прастагнала:

— Ма-ма!

У лялькі адарвалася і другая рука. Бедная лялька! Таня пашкадавала яе, асцярожна ўзяла на рукі і спытала:

— Табе баліць?

— Ма-ма! — зноў жаласна прастагнала лялька і заплюшчыла блакітныя вочы.

— Таня, кінь ляльку! — загадала мама. — Паглядзі, якая яна брудная!

— Мамачка, ёй жа баліць!

— Ляльцы не баліць, яна не жывая, — растлумачыла мама.

— Але ж яна плача, значыць — баліць, — сказала Таня і таксама заплакала.

Дома Таня выкупала ляльку ў ванне. Тата прырабіў ёй рукі, а мама пашыла квацістую сукенку. Ах, якой прыгажуняй стала лялька! Таня бярэ ляльку на рукі, і яна радасна кажа:

— Мама!

Рэцэпт на добрае выступленне!

— Мама, падрыхтуй мне якісьці вершык! — пазваніла на перапынку між урокамі дачушка. — Я хачу выступіць у дэкламатарскім конкурсе.

— Калі?

— Заўтра.

— Ну, то добра што не сёння, — у голасе мамусі прагучэлі ноткі іроніі.

Яна не любіла такіх званкоў. І ад таго хвалявання нават забылася спытаць пра конкурс. Да гэтай пары ёй здавалася, што каб выступіць у конкурсе, трэба любіць паэзію. Трэба яе чытаць для сябе, самастойна. Тады трапляюцца вершы, якія адразу падыходзяць па густу. Такія, якія адпавядалі б актуальнаму настрою, або краналі тэмы, пра якія якраз думаем. Такія вершы трэба пазначыць або перапісаць у сшытак. Пасля з іх ліку выбярэм самыя адпаведныя. На жаль, такі падыход вельмі рэдкі. У пераважнай большасці нашы дэкламатары выступаюць каб заваяваць прыз, каб паказацца на сцэне. Не заўсёды ўслед ідзе цікавасць да літаратуры. Калі на сустрэчах з дэкламатарамі пытаю пра іх рэпертуар, амаль ніхто не памятае аўтара. Жах! Быццам спрацоўвалі тут тэлевізійныя ўзоры, у якіх кожны, лепш ці горш, мае нагоду паказацца на сцэне: ці то з песняй, ці з танцам, ці ў нейкім тэлетурніры. І гэта нічога не значыць. Тупая прага папулярнасці не дапамагае нам у развіцці.

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Сэбастыян Місюк з Бельска-Падляшскага

Наадварот, яна робіць нас абыякавымі да справы, з якой выходзім.

А як атрымалася ў нашым выпадку?

Калі дачушка вярнулася са школы, з'ела абед, маці сказала:

— Ты, бусенька, не павінна выступаць у гэтым конкурсе!

— Але ж я вельмі хачу! — ледзь не заплакала малая.

— Ну, так, але каб хацець, трэба ўмець. Неабходна развучыць тэкст, улавіць яго ідэю, эмоцыі. Перадумаць кожны фрагмент, паспрабаваць „кожнага боку"! А на гэта ў нас няма часу. Кожнае выступленне мусіць выспець у часе, ахалонуць. Каб пасля глянуць на яго „згары" або іншага боку.

Паколькі ў маладой дэкламатаркі ў вачах паказаліся слёзкі, мама мігам прыдумала варыянт „б":

— То калі ўжо так хочаш, то ты павінна сказаць той верш, які ты гаварыла за сталом у дзень народзінаў дзядулі. Ён у меру ўжо дапрацаваны. Памятаеш словы?

— То przypał, — сыкнула малая і паляцела ў свой пакой. Пасля дзвюх гадзін яна вярнулася і папрасіла ў мамы прабачэння. Пасля сказала прапанаваны верш. Твор атрымаўся больш-менш добра. Ну, можа не хапала тых эмоцый як за дзядулевым сталом, той атмасферы свята. Але і так пры тым усім, што можна развучыць „на хаду", ён гучаў „на пяць".

На другі дзень, ужо пасля конкурсу, зноў пазваніла дачушка:

— Мамка, я заняла першае месца, — радасна зашчабятала малая. — Дзякую табе!

— То пазвані яшчэ дзядулю, — параіла малой маці, — і скажы пра свой поспех. Што за „ягоны" вершык ты сёння маеш радасць. Чаму? Бо добры верш, як і справу, мы вывучаем з любові да кагосьці або чагосьці. Разумееш.

— Ясна! — адказаў вясёлы галасок у трубцы.

ЗОРКА

Уладзімір ГАЙДУК

* * *

Для душы ёсць дом умоўны:
Гай і лес, поле і луг.
У кожнай дробінцы прыроды
Засакрэчаны нейкі ключ.

Узорных красак-летуценняў
У вянок мне не сабраць.
Спіць убаюканая снегам,
Белавежская вясна.

Ёй чаромхавая квецень
Сніцца ціхаю парой,
І раздолле з звонкім смехам,
І з напевам салаўёў.

Музыка з кайфам

Бардаўскае прозвішча

Фота Ілоны КАРПЮК

Калі тваё прозвішча — Камоцкі ці Камоцкая — мусіш стаць бардам. І хаця, для прыкладу, сёння Кася Камоцкая ўцякае ад сцэны, часцей займаецца журналістыкай, то яна заўсёды асацыявацца будзе з бардаўскай песняй. Алесь Камоцкі ведае, што ад этыкеты барда не ўцячэ, таму і нават са сваім лёсам не б'ецца, толькі ідзе наперад ды развіваецца.

Алесь Камоцкі нарадзіўся 9 чэрвеня і, як у выпадку ўсіх блізнятаў, яго характар раскрытым не будзе ніколі, застанецца таямніцай. Можа гэта часткова і таму, што закончыў філасофскі факультэт. Пры такой мяшанцы фактараў прывяду толькі прыкметы гэтага барда-мастака. У мінулым годзе пераступіў ён магічны парог паўвечча і, здаецца, з гэтага моманту рух у яго творчым жыцці стаў нібыта больш інтэнсіўны. Пасля дзевяці альбомаў, з якіх большасць адпавядала „восенскім" настроям бардаў з гітарай, прыйшоў час інструментальнага развіцця яго творчасці. З'явіўся сентыментальны альбом „З бацькоўскай кружэлкі" з выбарам савецкай класікі, на якім свае таленты прэзентуюць, між іншым, музыкі „WZ Orkiestra" ды цэлы спісак іншых інструменталістаў. Згаданы альбом Алесь Камоцкі запісаў перш за ўсё для сваёй прыемнасці (хаця не сумняваюся, што кожны альбом прыносіць аўтару задавальненне). Сёлета свет убачыў чарговы, свежы і пакуль што апошні альбом пад загалоўкам „9" і, як можна здагадацца, прэзентаваны быў 9.09.2009 года. З гэтага ўсяго рысуецца вельмі цікавая асоба, якая не толькі складае музыку, але таксама піша кніжкі. Апрача кніжак, таксама вершы, а вершы, бывае, выдаюцца ў афарбоўцы фотаздымкаў. Любіць мастацтва наш герой, любіць таксама басанову і жыццё. Таму, як прызнаўся ў размове, не думае пра старасць, а перш за ўсё пра поўнае радасных неспадзяванак сёння ды заўтра.

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 43

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 39:

Жарт, пот, баба, род, канон, шанс, жаль, сэнс, эліксір, сіні, Лама, хатка. Жыццё, дух, жэст, шалік, каліна, банькі, шанс, бо, сіла, пантэра, талісман.

Узнагароды, **фарбы-пастэлі**, выйграў **Рафал Вакулюк** з Арэшкава.



Ігар Сідарук

У КАВЯРНІ, ДЗЕ ВЕЧАР І ДЗЕ Ў КАВЫ ІНАКШЫ СМАК

Вось і яшчэ адна філіжанка кавы. Я сяджу ля акна, недалёка ад уваходу. Нібы і не гляджу ў той бок. Нібы мне ўсё роўна, што і гэтая філіжанка, і яшчэ, і яшчэ — маюць ужо даўно зусім не такі смак.

Толькі ніхто не здагадваецца аб тым. Ніхто. Ні гэтая купка маладых людзей, для якіх зусім не кава, а зараз лёгкае віно мае сваю смакавую выкшталцонасць. Ні строгая пашанотная кампанія, што абмяркоўвае цераз столік нейкае важнае бізнесоўства (што гарбата ці кава перад кожным з іх — так, антураж). Ні гэтая мілая парачка, для якой толькі адзінае мае цяпер сэнс, значэнне і смак — іхнія напаўраскрытыя вусны, іхнія нібы выпадковыя дотыкі наэлектрызаваных рук.

Але калісьці я ведаў чалавека, для якога мела значэнне і кава. Чаму ведаў? Ведаю і цяпер... Ты сядзела насупраць мяне, і такой жа аголенай электрычнасцю іскрыліся нашы рукі, калі раптам знаходзіліся сярод філіжанак, а ў кожнай той філіжанцы — трымцела крыху цьмянае адлюстраванне нашых твараў і нашых вачэй, якія, хоць гучыць і банальна, таксама іскрыліся.

Іскрыліся, таму што памяталі і не памяталі, чыя першай была прапанова паспытаць разам гэтай кавы. Кавы, у якой не толькі смак змолатых гэтак дробна і абсмажаных гэтак ахайна карычнева-горкіх зярнятак, але і крыху іншы: тваёй сонечнай скуры, растрапаных дымным ветрам кароткіх тваіх валасоў, маёй мужчынскай упэўненасці: усё, што мы робім — так правільна і так адчайна, нашых, як гаркавы апёк, перакрываючых дых пацалункаў.

А потым... Потым іх было вельмі шмат. Маленькіх крохкіх філіжаначак і вялікіх гліняных кубкаў. Шклянак і шкляначак. Самых розных сасудаў, кава з якіх — маленечкімі глыткамі, супакойваючай вечаровасцю, прыхаваным болем — наталяла і вярэдзіла, апякала і загойвала, нібы нагадвала як добра, як добра і як невыносна, што мы — нашы душы і целы — знайшліся. І змаглі паспытаць.

Я адстаўляю чарговую філіжанку. Усё выпіта, да самага дна. Да дна, дзе застаўся толькі густы асадак, гадаць па якім — таксама даўно няма ніякага сэнсу. Гадаць увогуле няма сэнсу. Таму што — ёсць жыццё і дакладнасць. Ёсць рэальнасць і логіка. Розныя акалічнасці і рух канкрэтных падзей.

І ёсць яшчэ такія хвіліны, калі, здавалася б, у самай звычайнай кавы з'яўляецца крыху інакшы смак.

Таму я зноў у гэтай кавярні. Зноў сяджу ля акна, недалёка ад уваходу. Нібы і не гляджу ў той бок. І нібы зусім не заўважаю, як успыхваюць ля ўваходу нечыя сонечныя дымныя валасы, і да століка далятае ледзь улоўны гаркавы пах...

03.08.2009

У Збучы спявалі, іграли і танцавалі

„Збучанкі"

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Жыхары Збуча і запрошаныя госці, сярод якіх былі войт Чыжоўскай гміны Юрый Васілюк і старшыня Гміннай рады Валянціна Якімюк, сабраліся ў вясковай святліцы 11 кастрычніка, каб паслухаць песень калектыву „Збучанкі". Маладыя музыканты іграли на скрыпцы і гармоніку, а пад іх музыку старэйшыя жыхары Збуча танцавалі. Нагодай для спаткання была першая публічная прэзентацыя кампакт-дыска „Моя матуля пэрэборнічка. Музычная культура вёскі Збуч".

— Не будзе сёння традыцыйных выступаў. Мы селі ў крузе і зрабілі вечаркі. Пагаворым, паўспамінаем, зайграем на даўніх інструментах, так як калісь бывала ў нас у мінулым, — заявіў вядучы мерапрыемства Дарафей Фіёнік, старшыня Аб'яднання „Музей малой айчыны ў Студзіводах", якое выдала кампакт-дыск. Прывёз ён з сабой калектыў „Жэмэрва", які выконваў песні, між іншым, і з рэпертуару „Збучанак". Калі зайгралі „абэрак" — на скрыпцы Мацей Філіпчук, а на акардэоне Дарафей Фіёнік — збуцкая жанчына папрасіла да танца аднаго з галоўных герояў мерапрыемства Пятра Юшкевіча, а разам з імі пайшлі ў скокі і „Збучанкі". Спадар Пётр, якому ўжо за дзевяноста гадоў, апошні раз публічна іграў на скрыпцы на студзіводскім фестывалі ў 2006 годзе. У час сустрэчы ўспамінаў ён пра музычны Збуч і таксама ўключаўся ў спеў. Яго колішнюю ігру на скрыпцы пахваліў Мацей Філіпчук, народны музыкант з Познані, які рэкамендаваў магнітафонныя запісы ігры Пятра Юшкевіча для кампакт-дыска. Вядучы Дарафей Фіёнік успомніў таксама музычную сям'ю спадара Пятра.

— Збуч сёння з'яўляецца цэнтрам музычнай культуры, — заявіў з захапленнем Дарафей Фіёнік, слухаючы спеў і народныя творы ў майстэрскім выкананні Мацея Філіпчука.

У мінулым Збуч быў асяродкам музычнай культуры ў сваім наваколлі. Інструментальную музыку ў выкананні гарманістаў, скрыпачоў і іншых знатакоў народных інструментаў можна было паслухаць у Збучы, як у міжваенны перыяд, так і пасля вайны. Пад гармонік і скрыпку танцавалі яшчэ ў шасцідзесятых гадах, а на хрысцінах нават у сямідзесятых гадах і пазней. Ніна Хворась са „Збучанак" сказала, што славуты музыкант з Орлі Уладзімір Мураўскі іграў яшчэ на хрысцінах яе дзяцей, а прысутны на сустрэчы Сцяпан Копа таксама ўспамінаў ігру арлянскага гарманіста ў Малінніках. У Збучы ў мінулым былі не толькі знатакі інструментальнай музыкі. Маладыя любілі таксама паспяваць, сабраўшыся ў сваёй кампаніі на лавачках або ў час сямейных мерапрыемстваў. Многа твораў са збуцкага рэпертуару спісаў менавіта Сцяпан Копа, які перад сабранымі ўспомніў пакойную ўжо Анну Якімюк.

— Яна была скарбніцай даўніх песень. Я запісаў ад яе многа твораў, — гаварыў вядомы музыкант і фалькларыст. — Сярод песень „Збучанак" таксама многа даўняга цікавага рэпертуару.

„Збучанкі" прэзентавалі рэпертуар з іншых вёсак, адкуль родам збуцкія спявачкі. Аднак не забывалі таксама песень, вядомых здаўна ў Збучы, адкуль родам сярод іх толькі Аляксандра Куптэль.

— „Збучанкі" — гэта цікавая фальклорная група. На вялікую ўвагу заслугоўвае іх прыгожы старажытны рэпертуар, які выконваюць так, як калісь спявалася, — гаварыў Сцяпан Копа.

Дарафей Фіёнік звярнуў увагу на музычны патэнцыял вёскі Збуч у мінулым. Паводле яго, прасоўванне па сацыяльнай лесвіцы часткі збуцкіх людзей мела непасрэднае ўздзеянне на больш буйное развіццё культуры ў Збучы.

— За гарадзішчам, што знаходзіцца побач Збуча, тысячагадовая гісторыя, а і самая вёска пазней была распаложана побач дарогі і непадалёк ад чыгуначнага пуці, па якіх цар прыязджаў у Белавежу. Гэтыя фактары мелі ўздзеянне на хутчэйшае развіццё сяла і матэрыяльнае ды сацыяльнае становішча яго насельніцтва. Пры царскай уладзе некаторыя жыхары Збуча займалі нават адказныя пасады, — тлумачыў Дарафей Фіёнік. — У вёсцы пачала развівацца музычная культура. На асаблівую ўвагу заслугоўвалі музыканты, што іграли на народных інструментах.

У міжваенны і пасляваенны перыяд вёска Збуч вылучалася сваім акуратным выглядам. Аднак Збуч пачаў набіраць асаблівага бляску ў сямідзесятых гадах, калі наогул перабудоўваліся ўсе нашы вёскі. Збудаваны былі тады новыя драўляныя і мураваныя дамы, адноўлены старыя хаты. Паявіліся маляваныя платы і лаўкі. Хаця людзі на лаўках ужо не спявалі, то гутарылі на розныя тэмы. Зараз сяло крыху пахмурнела, некаторыя хаты ўжо пустуюць, а ў іншых, так як у доме Пятра Юшкевіча, жывуць адзінокія пенсіянеры.

У нядзелю, 11 кастрычніка, на лавачках было пуста. Было ж халаднавата. Старэйшыя людзі пайшлі ў вясковую святліцу, каб паслухаць музыку сваёй моладасці. Збуч жыў музыкай у мінулым і ажыў у свядомасці яго жыхароў у кастрычніцкую нядзелю.

Да мерапрыемства загадзя акуратна падрыхтаваліся „Збучанкі", дапамаглі ім вяскоўцы. Суарганізатарамі вячорак былі Гмінны асяродак культуры ў Чыжах і студзіводскае аб'яднанне. На спатканне прыбыў таксама дырэктар ГАК у Чыжах Юрый Якімюк.

— Зараз мы блудзім, бо забываем аб нашай тоеснасці. Вы, выпускаючы дыск, зрэалізавалі незвычайны праект, — заявіў войт Юрый Васілюк, які асаблівую ўвагу звярнуў на „Збучанак", называючы іх стваральнікамі гісторыі гміны.

Наперамен са „Збучанкамі" даўнія песні спявала „Жэмэрва", якая прыехала ў асноўным з малодшымі спявачкамі, а бубнаром выступіў сын вядучага, Ілья Фіёнік. Публіку захапіў таксама скрыпач Мацей Філіпчук, які выконваў народную збуцкую музыку. Інструментальная музыка, што была збуцкай спецыяльнасцю, безумоўна заслугоўвала на запісанне яе на кампакт-дыск. Добра, што захаваліся магнітафонныя запісы, бо зараз ужо немагчыма было б запісаць ігру на скрыпцы ці гармоніку-трохрадцы з першых рук. У час мерапрыемства можна было купіць новы дыск „Моя матуля пэрэборнічка. Музычная культура вёскі Збуч". Можна будзе яго яшчэ набыць у Музеі малой айчыны ў Студзіводах, Беларускім музеі ў Гайнаўцы і ў час беларускіх мерапрыемстваў. Гмінны асяродак культуры ў Чыжах прадбачвае выдаць яшчэ кампакт-дыск з песнямі ўсіх калектываў Чыжоўскай гміны. Трапяць на гэты дыск таксама і песні ў выкананні „Збучанак".

Дарафей Фіёнік расказаў пра новы дыск, а ігрой на скрыпцы і песнямі ўспамагалі яго Мацей Філіпчук і „Жэмэрва" (збоку, справа Пётр Юшкевіч)

Засакольская спадчына

Тэкст і фота
Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Ранні аўтобус з Саколкі ў Дуброву цераз Рэшкаўцы — пуставаты. На пачатковым прыпынку загружаюся толькі я, у цэнтры горада сядае яшчэ адна жанчына, як пасля акажацца — настаўніца пачатковай школы ў Навінцы, што на самім захадзе Сідранскай гміны. Толькі ў Трасцянцы, якая ў Янаўскай гміне, сядае ў аўтобус чародка школьных малечаў, якія, быццам куранятки ля квактухі, шчыльна займаюць месцы побач сваёй сакольскай выхавацелькі. Калі аўтобус праязджае побач касцёла ў Маеве, уся дзетвара шчыра жагнаецца. З Навінкі ў Рэшкаўцы еду ў якасці адзінага пасажыра і калі мне ўжо пачало здавацца, што далей у Дуброву вадзіцель паедзе сам, у тых жа Рэшкаўцах мяне замяняе нейкая сярэдніх гадоў жанчына. Што пасажыраў у ваколсакольскіх аўтобусах меншае можна заўважыць і па сакольскім аўтобусным бараку-вакзале, які зараз адкрываецца толькі на зломе месяцаў, каб прадаць месячныя білеты...

На вуліцы ў Рэшкаўцах з раніцы пуста. Такі цяпер час, вёска памяняла свой рытм жыцця — паменшала актыўных земляробаў, пабольшала пенсіянераў, якім нечага спяшацца навонкі сваіх панадворкаў. Пабудаваныя калісь столікі для малочных бітонаў цяпер таксама павыходзілі на пенсію. Толькі яшчэ са шмат якіх панадворкаў адзываюцца курыныя галасы, бо ж гэтых птушак яшчэ найзручней — і па прывычцы — трымаць пажылым вяскоўцам. У Рэшкаўцах каля пяці вялікіх мураванак і, мабыць, столькіх там сялян займаюцца вялікатаварнай сельскагаспадарчай вытворчасцю; у агародчыках перад кожнай з гэтых мураванак — крыж. За вёскай узводзіцца яшчэ адна буйная мураванка. Іншыя хаты традыцыйнага выгляду і памеру. Заўважаю тры вялікія драўляныя хаты, пустыя, але няма ў каго пра іх былую ролю запытацца.

Адкуль выводзіцца назва вёскі? Хто ведае, мо гэта нейкая патранімічная назва, на падабенства не надта адсюль далёкіх Бутрымаўцаў (ад прозвішча Бутрым), Беняўцы (ад Беня — Венядзікта), Плябанаўцаў. Ці не ад нейкага Рэшкі тая назва ўзялася? А Рэшка ж можа быць скарачэннем ад Гарэшкі (персанаж „Пана Тадэвуша" Міцкевіча) ці спаншчанага Ажэшкі (гэта ж прозвішча вядомай гродзенскай пісьменніцы) ці ... А найменаванне Гарэшка магло пайсці ад арэшніку-гарэшніку, так як Вярбіцкі ад вярбы...

Пры адгалінаванні дарогі ў Няросна ад брукаванай рэшкаўскай вуліцы стаіць пабеленая каплічка, якая, мабыць, была пастаўлена побач каменнага помніка-крыжа з 1882 года — значыць пазней ад яго — і, набыўшы буйнасці, быццам нейкі буян адхіліла яго ад сябе ўбок. Такіх помнікаў даўніны ў Рэшкаўцах больш, м.інш. каля аўтобуснага завароту стаіць векавы жалезны крыж на каменным пастаменце без захаванай ужо даты. І з заходняга канца вёскі ёсць чыгунны крыж з 1881 года. А далей ад яго, па сутнасці ўжо за вёскай, стаіць і школьны будынак, мабыць, узведзены ў эпоху будавання „тысячагодак", які з першага позірку падаўся мне пустуючым, аднак пазней прыкмеціў я звыш дзесятка веласіпедаў побач яго. І на асветнай вэб-старонцы ёсць інфармацыя, што вучыцца ў той падставоўцы 38 дзетак у чатырох аддзелах; не ручаюся, аднак, за сапраўднасць гэтай інфармацыі, бо ў пераліку школ Дуброўскай гміны ёсць і школа ў Гарасімавічах, якой з гэтага навучальнага года мела не быць...

За вёскай шмат кукурузных палеткаў, кукуруза сёлета вырасла як лес, высокая, прыгожая. На пашах відаць невялікія статкі коней г.зв. сакольскай пароды — моцнага складу цела. Заўважаю таксама арыгінальны метад тэрмаізаляцыі аднаго з гаспадарчых будынкаў, які абкладзены шасцігранымі цюкамі саломы. Упрытык са сцяной лесу, які вузкай касой раздзяляе заходнюю і ўсходнюю часткі Сакольшчыны, свінарнік.

А лес пачынаецца маналітнай дубровай, толькі дзе-нідзе — мабыць на месцы высечак — відаць дамешкі іншых дрэў. Неўзабаве мінаю дрывасекаў, якія, а як жа, як гэта на Сакольшчыне, у даверанай кампаніі дзекаюць, але калі з'явіцца нехта звонку, яны, як аўтаматы з дыстанцыйнымі дэтэктарамі, перакліканцца на пшэканне.

Перасякаю лясок і выходжу на прытулены да лесу прысёлак вёскі Капцёўка з некалькіх хутароў. І з гэтага боку да самога лесу прылягае жывёлаводчы будынак, на якім ад пройдзенай мною жвіроўкі паказаны афішы і пластмасавыя фігуркі конскіх галоў. Магчыма, што пачапіў іх там нейкі летуценны канялюб, бо навокал не відаць было адпаведных такому захапленню табуноў. Перад адной з хат патанае ў зелені мураваная каплічка, якую вельмі развальна пакусаў зуб часу. Жанчына з супрацьлеглага панадворка, калі я яе спытаў пра гэты аб'ект, не ўмела мне сказаць калі, дзеля чаго і кім быў той абярэг пабудаваны, але затое стала мне тлумачыцца, што гаспадары каплічкі збіраюцца правесці ў недалёкім часе яе рамонт.

У самой вёсцы Капцёўцы таксама шмат старых крыжоў, вельмі прыгожых — мабыць выкананых з малітоўным жарам. Той жар гарыць яшчэ і ў цяперашні час і прыносіць адмысловыя вынікі. Вось у пачатку вёскі, з усходняга боку, красуецца на векавым камені адліты з сучасных металургічных профіляў крыж, з прычэпленай чыгуннай табліцай з 1882 года. Пажылы мужчына, у якога я спытаў пра неадлеглы ад ягонай хаты каваны жалезны крыж з двума анёлкамі, пастаўлены на адмысловым драўляным пастаменце, нічога пра яго не ведаў. Сказаў ён мне затое, што крыж у агародчыку побач — на бетонным пастаменце — паставіла цётка ягонай мамы, як калісь была прыехала з Францыі.

Але гэты мужчына задзівіў мяне іншым — ён выйшаў з хаты паліквідаваць пустазелле, што вырасла на абочыне вуліцы насупраць ягонага панадворка. Традыцыйна на вёсцы такое дзеянне праводзілася нейкай касою ці іншымі прыладамі з прыцягненнем сілы рук, а ў больш сучасны час газоннай касілкай. Але ж выдумкі вучоных розныя і яны трапілі пад вясковыя стрэхі, у тым ліку і — а як жа ж! — гербіцыды. Вось узяў чалавек наплечны распыляльнік, з дапамогай якога раней атручвалі каларадскага жучка, напоўніў яго ядавітым рэчывам і рушыў на перадавую свайго панадворка, што на вулічнай абочыне.

Хата на рэшкаўскім хутары

Некалькі хат далей развесяліў мяне іншы гібрыд новай вясковай тэхнікі з традыцыйным ладам вясковага побыту. На вялікім, поўным дроў каўшы, прычэпленым да трактара і падвезеным пад акно высокага падвала, стаяла жанчына і скідала тыя дровы ў тое акно. Хацелася гаспадару пабудаваць вялікі дом, палац, з высокім падвалам — то і пабудаваў такі. І жонку пашкадаваў, каб не насіла дроў у руках, дык пасадзіў яе ў коўш з паленамі і пад высокае акенца прыпаднёс, быццам прынцэсу на высокі казачны ярус...

Драўляны крыж у Капцёўцы

Яшчэ далей высокі драўляны, старанна выкананы крыж; пра яго пытаю двух вяскоўцаў сярэдняга ўзросту. І яны інфармуюць мяне, што нічога пра яго ўзнікненне не ведаюць. І размаўляюць яны на такой цудоўнай на слых польскай мове, з такою фанетыкай, з такім „следзікаваннем", што не можа быць сумненняў, якая штодзённа сфармавала іхнюю фанетыку.

Мае роспыты пра вясковыя святыні навялі на мяне эканамічныя асацыяцыі, калі празмернасць тавару паніжае яго цану. Вось і гэтыя крыжы, пра якія я распытваў, хаця выкананыя калісь з вялікім жарам, сталіся цяпер нечым надта паўсядзённым, нявартым увагі. Цяперашняе пакаленне ў сваім штодзённым побыце быццам махнула рукой на пакінутую яму продкамі спадчыну. Хіба не беспадстаўна...

Можа цяпер менш, але яшчэ не так даўно выразна можна было — не толькі на Сакольшчыне — заўважыць своеасаблівае раскулачванне — не з матэрыяльнай спадчыны продкаў, але з духовай. Не буду я ў гэтым месцы займацца меркаваннем, хто ў гэтым спектаклі трымае ролі палітрукоў, а хто іншых персанажаў тутэйшай займальнейшай грамадскай пастаноўкі... Заглянуў я на сайт Сухаволі, якая з'яўляецца гмінным цэнтрам для Капцёўкі. З культурных мерапрыемстваў знайшоў я толькі адно, прысвечанае тамашняй спадчыне: прагляд велікодных пальмаў. Пра святочную і будзённую народную абраднасць — ні слова. Затое на сухавольскім сайце змешчаны дакладны расклад усіх набажэнстваў на тэрыторыі гміны...

Цытата пра гісторыю: „Suchowola pierwotnie nosiła nazwę Suchaja Jaćwież, która pochodziła od plemion Jaćwingów zamieszkujących okolice. Następnie rzeczownik „Jaćwież" z czasem zamieniono na „wola", a „suchaja" przekształciło się w „sucha". Według źródeł historycznych, początków osadnictwa w Suchowoli można szukać na przełomie XIV i XV wieku. Były to prawdopodobnie okolice dzisiejszej ulicy Białostockiej. Pierwszymi mieszkańcami były wspomniane wcześniej plemiona Jaćwingów, które następnie zostały zdominowane przez napływową ludność polską z Mazowsza. Oba te narody zasymilowały się ze sobą, a historyczną pozostałością tamtych czasów są szczątkowe ślady po kurhanach i cmentarzyskach jaćwieskich np. Jatwież Mała"...

Мая ранейшая заўвага пра раскулачванне — невыпадковая. Бо ў матэрыяльным сэнсе быў тут накіраваны агульны высілак на ўзбуйненне сельскагаспадарчай вытворчасці. Амаль на кожным панадворку ў Капцёўцы ёсць менш ці больш сучасны будынак для размашыстай жывёлагадоўлі. Толькі гэтае спаборніцтва за прадукцыйныя ўраджаі не ўсім змагарам выйшла на здароўе — вакол некаторых з гэтых будынкаў слядоў актуальнага гаспадарання не відаць...

З Капцёўкі падаўся я ў бок Паломіна. Перад Паломінам, побач асфальтоўкі пабачыў я яшчэ адзін сакральны помнік даўніны — мураваную каплічку з мая 1859 года; значыць ёй сёлета стукнула сто пяцьдзесят гадоў! У нішы, якая кранае грунту, ахвяравальны надпіс, які вельмі стойка бараніўся ад наступу часу, аднак у цэласці да нашых дзён ён не захаваўся. Мне ўдало-

працяг ☞10

Засакольская спадчына

9 ☞ працяг

ся прачытаць толькі фрагмент: „Za ludzi czule kochających i nieutulonych”. Яшчэ ёсць прозвішча Zuzanny z Kretowiczów, яшчэ чытабельныя некаторыя асобныя словы... А насупраць Паломіна яшчэ і драўляная каплічка, абведзеная драўляным плоцікам.

Ад Паломіна пайшоў я ў бок парафіяльнай Галадаліны; мяркую, што назву мясцовасці сухавольскія інтэлектуалы таксама выводзяць ад яцвягаў. Па дарозе на адным з панадворкаў побач падсыпанай жвірам дарогі можна пабачыць адмысловую сталовую катэгорыі open-air з дахам з футурыстычнай гонты. Не даходзячы да Галадаліны падаўся я ў напрамку працякаючай побач вёскі рачулкі, падумаўшы, што мо там знайду крыніцу назвы вёскі. У даліне рачулкі Альшанкі, якая далей агібае і Сухаволю, як сама назва падказвае, расце крыху вольхаў. Значыць, не голая тая даліна, у ёй старанна апрацоўваныя жывёлай пашы. І на мастку праз рэчку, на яго бетонным бар'еры, запісана важная гістарычная інфармацыя: „CZYN SPOŁECZNY GROMADY HAŁODOLINA DLA UCZCZENIA 22 LIPCA 1955 ROK”. Сама вёска Галадаліна не надта вялікая, раптам там будзе каля дзесятка дамоў, але багатыя гэта дамы; мо калісь даліна Альшанкі была там голая, але не цяпер! Парафія ў Галадаліне была заснавана ў 1978 годзе, а цяперашні касцёл быў узведзены ў 1986 годзе.

Касцёл у Галадаліне

З Галадаліны падаўся я ў Вольку. Перад вёскай школа, побач якой пад адкрытым небам займалася каля дзесятка дзетак дашкольнага ўзросту з настаўніцай. На згадваным ужо раней асветным сайце напісана, што ў Вольцы вучыцца 53 вучняў у пяці аддзелах. У вёсцы будынак пажарнага дэпо, у якім, здаецца, вясковая святліца, дзверы ў якую, як мне паказалася, адкрыты кругласутачна. У геэсаўскай краме, якая пабудавана паводле тыповага праекта з нізкімі, выгаднымі для сядзення, падаконнікамі, крыху вясковага „актыву”; у прыватнай краме, з высокімі вокнамі, „актывістаў” няма.

Каплічка каля Дубасеўшчыны

З Волькі выбіраю пазначаную на карце дарогу ў Дубасеўшчыну. І так сабе крочу тою дарогай, але яна мяне — так заўважаю па мясцовасці — вядзе не туды, куды я задумаў. Побач дарогі жанчына сярэдніх гадоў збірала сахорам націнне бульбы з бульбянішча і я спытаў яе пра тамашнія дарогі. Яна мяне ашарашыла, паведаміўшы, што я іду не ў Дубасеўшчыну, а ў вольчанскія палі і далей у лес. Дастаў я карту, а яна, вясковая жанчына з віламі, шпарка паказала мне на той паперы ўсе дарогі, у тым ліку і правільную, якую я раней праваронію. І яшчэ, у дадатак, растлумачыла мне, чаму я збіўся з дарогі. Менавіта, у мінулым годзе гмінныя ўлады навезлі жвіру на тамашнія палявыя дарогі, каб сялянам зручней было ездзіць трактарамі на палі і пашы; такім чынам дарогі ў поле набралі важнейшага выгляду ад міжвясковай дарогі з Волькі ў Дубасеўшчыну, на якую ў такіх абставінах мне нават не падумалася звяртаць увагу.

Паказала мне тая жанчына правільную дарогу не толькі на карце, але і высокі драўляны крыж, ад якога тая дарога адыходзіць. Вось і роля крыжа ў полі: ён не толькі пуцяводны на духовых раздарожжах, але і на жвіровых. І пра тую адукаваную жанчыну падумалася мне, што мо іншая — мо з нашай Усходняй сцяны — з яе кемлівасцю мо ў бок сахароў і не глянула б. А там, вось, людзі не надта хочуць раскулачвацца з зямлёй-карміцелькай, з матэрыяльнай хаця спадчынай...

Легенды Беларусі

Ці магла б існаваць гісторыя якога-небудзь народа без міфаў і легендаў аб ім? Пэўна, не. Гісторыя без натуральнай прадузятасці была б звычайнай храналогіяй, з якой немагчыма было б зразумець прычыны гістарычных падзей. А такая прадузятасць выцякае з поглядаў людзей, сярод якіх ёсць і гісторыкі, на сваіх продкаў і іх учынкі. У сваю чаргу на фармаванне гэтых поглядаў уплываюць, між іншым, казкі, байкі, міфы і легенды — гэта значыць, усё тое, ад чаго ніхто не патрабуе нейкай аб'ектыўнасці і непрадузятасці. З-за гэтага міфы і легенды цяжка разбурыць, а час іх існавання — амаль бясконцы.

Беларусы таксама, як і іншыя народы, маюць уласныя міфы і легенды. Некаторыя з іх змешчаны на сайце **www.legenda.by**, які называецца „Легенды Беларусі”.

„Легенды і міфы — аснова народнай творчасці, якая найбольш яскрава адлюстроўвае асаблівасці культуры і менталітэт народа. Яны перадаюцца ад пакалення да пакалення, на працягу стагоддзяў легенды і міфы развіваюцца, ускладняюцца, удасканальваюцца, акумулюючы ў сабе калектыўны вопыт і адлюстроўваючы светапогляды народа, яго ўяўленні пра маральнасць, прыгажосць. Міфы, легенды, паданні — гэта наша культурная спадчына, якая дазваляе нам пабачыць свет вачыма нашых продкаў”, — з такімі словамі звяртаюцца да наведвальнікаў „легендарнага” сайта ягоныя аўтары, якія, згодна з пададзеным далей, належаць да дызайн-студыі „Крэатыў-Лабараторыя 82”.

Асноўнай мэтай праекта аб міфах і легендах з'яўляецца зацікаўленне і звяртанне ўвагі чытачоў „на багатую скарбонку нашай культуры і гісторыі праз міфалагічную выснову пэўных мясцін”.

Сайт зроблены не зусім традыцыйна. На ім няма звычайнага жорсткага дзялення на тры альбо дзве часткі. Папросту злева падаюцца анонсы некаторых тэкстаў, а справа месціцца карта. Праўда, вялікага сэнсу ў яе існаванні пакуль не прасочваецца — там, дзе наведзеная мышкай далонь пераўтвараецца ў стрэлку, падаецца толькі рускамоўны расповед пра Мірскі замак.

Якога-небудзь дзялення на рубрыкі на сайце „Легенды Беларусі” няма. Замест іх выкарыстоўваюцца тэгі — своеасаблівыя тэматычныя спасылкі. А ўжо іх даволі многа, і сабраны яны ўсе ў левым ніжнім вугле сайта. Легенды і міфы з гэтага сайта падзяляюцца на наступныя тэмы: азёры, гарады, вёскі, каханне, рэкі, жывёлы, разбойнікі, Менск, паганскія багі, Бог, гарадскі пасёлак. Апошняя тэма не зусім зразумелая спачатку, але, калі клікнеш на яе, то перад вачыма з'яўляюцца назвы двух мястэчак — Івянец і Поразава. Менавіта аб іх і распавядаюць размешчаныя на данай старонцы легенды.

Варта адзначыць, што сайт двухмоўны. Маецца як беларуская, так і руская версіі. Праўда, беларуская мова тут пазначаецца не зусім адпаведным прыметнікам „беларускі”.

Аўтары сайта, на жаль, не падаюць сваіх імён і прозвішчаў. Але магчымасць звязацца з імі існуе — унізе выяўлення месцяцца тэлефоны, ICQ-нумар і адрас электроннай пошты. Таму, калі хтосьці зацікавіўся даным праектам, аўтары сайта заклікаюць да супрацоўніцтва. „Калі наш праект падаўся Вам цікавым, калі Вы жадаеце дапамагчы з матэрыяламі, працай над праектам ці ў Вас ёсць цікавыя ідэі, будзем удзячныя за актыўны ўдзел у распрацоўцы праекта”, — кажуць яны.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь, беларусы...

Чарговы прыз генія

Калі на нядаўнім чэмпіянаце кантынента па настольным тэнісе Уладзімір Самсонаў выступіў няўдала (зразумела, што для майстра яго роўню), многім падалося, што гэта ўжо незваротны заход кар'еры выдатнага тэнісіста сучаснасці. Каюся, такой жа думкі быў і аўтар гэтых радкоў. Але прайшло зусім няшмат часу і Самсонаў чарговы раз пасароміў скептыкаў. На мінулым тыдні беларус стаў трохразовым уладальнікам Кубка свету па настольным тэнісе. На прэстыжным турніры ў Маскве сярод мацнейшых прафесіяналаў свету, які сабраў 16 супергульцоў, ён узяў галоўны прыз. Гэты поспех напэўна заслугоўвае больш дэталёвага і падрабязнага апісання. На папярэдняй стадыі ў групе нумар тры Самсонаў выйграў усе тры паядынкі: адпаведна ў прадстаўнікоў Ганконга Чэн Юка — 4:1 (8, 11, 10, -7, 8), Кітая — Чэн Цы — 4:3 (10, -9, 10, 9, -13, -12, 3) і Бразіліі з японскім прозвішчам Казуа Мацума — 4:0 (5, 8, 6, 7). Далей на дарозе на стадыі чвэрцьфіналу стаяў прадстаўнік Нямеччыны расейскага паходжання Дзмітрый Аўчароў, які паспяхова выступае апошнія гады за сваю новую радзіму. Самсонаў не даў гледачам ні маленькага сумнення ў тым, хто мацнейшы на сённяшні дзень. Ён упэўнена выйграў гэтую сустрэчу з лікам 4:1 (8, 5, 8, -8, 8).

Але галоўнае выпрабаванне было наперадзе. Паўфінальная бітва адбылася з другой ракеткай свету кітайцам Ма Лонам, які сваім парадкам на шляху адолеў 4:2 немца Ціма Боля, першага нумара еўрапейскага настольнага тэніса. Зрэшты, з еўрапейцаў толькі Самсонаў і Боль здольныя час ад часу адолець прадстаўнікоў славутай азіяцкай школы. На гэты раз беларус, які на сёння з'яўляецца шостай ракеткай свету, змог перамагчы знакамітага кітайскага аса — лік па сетах 4:3 на яго карысць (-7, 5, -8, 4, 12, -8, 8). Заўважым, што ў пятай партыі Уладзімір адыграўся пры ліку 5:10 (!), а ў вырашальнай пры ліку 5:8. Хто хоць крыху знаёмы нават на аматарскім роўні з пінг-понгам, зразумее, што гэта значыць. Такую б волю характару прадстаўнікам беларускіх зборных па гульнёвых відах спорту!

Саступіць у фінале Самсонаў ужо не мог. Хоць сапернік і тут быў даволі грозны — зноў той сам прадстаўнік Паднябеснай Чэн Цы, дзевяты ў сусветным рэйтынгу. Беларуса было ўжо не спыніць, не разбіць, не стрымаць і ён заставіў укленчыць апанента з Азіі. У выніку табло зафіксавала 4:1 (4, -5, 7, 5, 11). Лічбы ў дужках яскрава сведчаць пра характар гэтай гульні. Застаецца дадаць, што да гэтага Самсонаў браў першы прыз на Кубку свету ў 1999 і 2001 гадах. А ўвогуле беларускі віртуоз настольнага тэніса быў і застаецца адной з ярчэйшых зорак нашага часу ў гісторыі гэтага віду спорту — поруч з кітайскімі майстрамі, шведам Ёргенам Персанам, бельгійцам Жанам-Мішэлем Сэйвам, тым жа Болем. За больш чым дваццаць гадоў кар'еры Самсонаў станавіўся неаднаразовым прызёрам чэмпіянатаў свету, чэмпіёнам Еўропы ў адзіночным, парным і змешаным разрадах, а таксама ў камандавым заліку, быў некаторы час першай ракеткай свету. У яго калекцыі няма толькі алімпійскага медаля (вышэйшым было 5-е месца на алімпіядзе ў Сіднеі ў 2000 годзе). Але можа і алімпійская ўзнагарода яшчэ наперадзе?

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Белавежскі могільнік

Пётр БАЙКО

Фота Тамаша НЯХОДЫ

Аўтар артыкула ля магілы сваіх бацькоў

Могільнік у Белавежы гэта, несумненна, адзін з тутэйшых турыстычных атракцыёнаў. У чым справа? — спытае хтосьці. У старых, цікавых намагільных плітах? У нетыповым краявідзе? А мо яшчэ у чымсьці іншым? Вось менавіта — у чымсьці іншым! Белавежскі могільнік характэрны поўнай экуменіяй. Хаця адмініструе ім праваслаўны прыход, дазваляюцца тут пахаванні вернікаў іншых рэлігій, а таксама памерлых няверуючых. Няма тут і канфесійных кватэр. Памерлых хаваюць так, як яны і жылі — побач сябе, нягледзячы на тое, на якой яны мове пры жыцці размаўлялі, ці ў які храм хадзілі і ці наогул хадзілі. Таму на гэтым могільніку побач сябе стаяць крыжы праваслаўныя і каталіцкія, а надпісы на іх выкананыя таксама і кірыліцай, і лацінкай. І яшчэ адзін незвычайны ў наш камерцыйны час факт — сям'я нябожчыка не плаціць за месца пахавання. Я не ведаю другога такога могільніка — калі б хто ведаў, прашу паведаміць мне і заадно чытачам „Нівы".

Белавежскі могілнік быў заснаваны праўдападобна ў першай палове XVIII стагоддзя. Памечаны ён на карце з 1784 года, выкананай Міхалам Палхоўскім. Вядома нам, што ў той перыяд існавала ўжо на могільніку царкоўка святых Кірылы і Мяфодзія. Захавалася першае яе апісанне з 1790 года. Царкоўка была збудавана з дрэва, прыкрытая саломай. У 1873 годзе на сродкі прыхаджан узведзена была новая могільнікавая царква, таксама драўляная. У тым самым годзе закуплена была для яе ікона за 201 рубель.

У перыяд І сусветнай вайны на могільніку адведзена было месца для памерлых нямецкіх жаўнераў і чыноўнікаў. Збераглося яно ў рэшткавым выглядзе да пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя. Побач некалькі гадоў пазней з'явіліся магілы польскіх жаўнераў, якія загінулі падчас вайны 1920 года. Гэтыя пахаванні таксама не збераглися да нашых дзён.

У 1932 годзе могільнік пашыраны быў на адзін гектар прыватных сумежных грунтаў. Праваслаўны прыход адступіў двум іх уласнікам паўгектара сваёй ворнай зямлі.

Калі 1 верасня 1939 года ад бамбардзіравання была пашкоджана прыхадская царква ў Белавежы, у могільнікавую царкву перанесены былі ўсе багаслужбы. Гэтак працягвалася да паловы кастрычніка 1943 года. У той час да могільнікавай царквы дабудавалі прытвор.

Падчас нямецкай акупацыі на могільніку хавалі людзей павешаных гітлераўцамі публічна на дрэвах перад царквой. Пасля вайны паставілі тут мемарыяльную кампазіцыю і дошкі з прозвішчамі загінуўшых.

У пасляваенны перыяд могільнікавая царква некалькі разоў рамантавалася. Апошні, грунтоўны рамонт быў праведзены ў 2006 годзе.

Перыядычна на могільніку праводзіцца высечка старых дрэў, якія ствараюць пагрозу для намагільных пліт і наведвальнікаў магіл сваіх блізкіх. Апошняя высечка мела месца ў 2003 годзе. Дрэвы растуць на старэйшай частцы могільніка.

У 1983 годзе на могільнік давялі адгалінаванне гміннага водаправода.

У 1995 годзе гміна перадала праваслаўнаму прыходу ў якасці кампенсацыі за маёмасць страчаную пасля ІІ сусветнай вайны два гектары зямлі, што на поўнач ад могільніка. У такі спосаб могільнік пашырыўся да 4,2 гектара. Яго спярша добраўпарадкавалі, а ў 2001 годзе агарадзілі. Чатыры гады пазней на галоўнай дарожцы могільніка быў пракладзены польбрук, а ў 2007 годзе на ёй з'явілася асвятленне.

Найстарэйшая захаваная магіла на могільніку паходзіць з 1861 года. На навейшай частцы могільніка звяртае ўвагу некалькі артыстычных драўляных надмагільных кампазіцый аўтарства Станіслава Банаха.

З больш вядомых асоб на белавежскім могільніку пахаваны м. інш.: капітан Мікалай Абрамаў (пам. 1910) — бацька вядомага польскага пісьменніка Ігара Неверлі; генерал Юзэф Булак-Балаховіч (1894-1923) — намеснік камандзіра Народнай добраахвотніцкай арміі, удзельнік польска-бальшавіцкай вайны; д-р інж. Станіслаў Бароўскі (1911-1994) — заолаг, прыродазнаўца, расказчык і экскурсавод, першы з белавежскіх навукоўцаў пахаваных на гэтым могільніку; праф. Ежы Гнеўшэў (1926-2002) — капітан першага рангу Ваенна-марскога флоту, акадэмічны выкладчык; генерал брыгады, лётчык Міхал Полех (1932-1999); праф. Януш Богдан Фалінскі (1934-2004) — геабатанік, эколаг, шматгадовы кіраўнік Белавежскай геабатанічнай станцыі ВУ; праф. Здзіслаў Пуцэк (1930-2007) — заолаг, шматгадовы дырэктар Лабараторыі даследавання млекакормячых ПАН; айцец мітрат Клаўдзій Пушкарскі (1905-1998) — шматгадовы настаяцель праваслаўнага прыхода ў Белавежы; Пётр Шпаковіч (1928-1981) — мастак, рэжысёр мультыплікацыйных фільмаў.

Фота Тамаша НЯХОДЫ

Найстарэйшая магіла на белавежскім могільніку

ЗАПРАШЭННЕ

Генеральнае консульства Рэспублікі Беларусь, Культурны цэнтр Беларусі пры Пасольстве Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Польшча, Цэнтр праваслаўнай культуры ў Беластоку і Беларускае гарамадска-культурнае таварыства ў Польшчы

запрашаюць на

ЧАЦВЁРТЫ ВЕЧАР БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ

які адбудзецца **6 лістапада 2009 года а 14-й гадзіне ў Цэнтры праваслаўнай культуры ў Беластоку** (вул. Св. Мікалая, 5).

У **праграме:** * прэзентацыя перавыдадзенага святога „Слуцкага Евангелля" * выступленне калектываў Цэнтра творчасці дзяцей і моладзі Беларускага Экзархата **„Сунічка"** і **„Скавыш"** * адкрыццё выставы іканапісца Віктара Доўнара (Мінск, майстэрня „Іконік") * выступленне праваслаўнага мужчынскага ансамбля **„Благавест"** Выдавецтва Беларускага Экзархата * выстава-продаж кніг праваслаўных выдавецтваў Беларусі і Польшчы, а таксама царкоўнай утвары.

Адгаданка



1. цячэ ў ярок, 2. дол, 3. дрэва сямейства ружакветных (цюрк. *ajva*), 4. злавіў залатую рыбку, 5. каманда брыгадзіра, 6. дзвінскі горад у Смаленскай вобласці, 7. муж якуткі, 8. салодкі спіртны напітак з ягадных сокаў, 9. металічная пласцінка для пісання атрамантам, 10. пасцельны доўгі мяшок напоўнены пухам, 11. працяглая стральба з вялікай колькасці гармат.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — афрыканская пагаворка.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 38 нумара

Дзюна, мелодыя, памяць, серыя, сом, стараннасць, цаліна, Ціта.

Рашэнне: **Маладыя не знаюць старасці, старыя не помняць маладосці.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў і **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130,5 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2010 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 6,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,90 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 060 egz.

Фота і тэкст
Ганны КАНДРАЦЮК

У Мастаўлянах усе нараджаліся маленькімі (9)

(пачатак у 33 н-ры)

Каб асвятліць Вікенція Канстанціна Каліноўскага, трэба пачаць ад асноўнага — вярнуць яго вобраз у нацыянальную спадчыну. Яго твар размываецца ў дзесятках партрэтаў і скульптур, медалёў і бюстаў. Яго ніякім чынам не ўлавіць, бо вобраз расплываецца ў патоку стыляў і характараў. Раз напамінае ён лёгкакрылага рамантыка, іншы раз падвыпіўшага партызана айчыннай вайны ў цяжкім кажусе з аўчын. Самы вядомы партрэт, аўтарства Пётры Сергіевіча (ведаем яго са школьных падручнікаў), прадстаўляе прыстойнага маладзёна з прыгожым, добрым і шляхетным абліччам, у ядбабнай кашулі з характэрным каўнерам-„крайкай". У паліцыйных запісках-вышуках Каліноўскі зусім іншы — ён сярэдняга росту, шатэн, з грубаватымі рысамі твару. Апошняя характарыстыка падыходзіць да мянушак Вікенція Канстанціна: Хамуціс, Хам, Кайноўскі. У паліцыйных занатоўках ён — чалавек-прывід, цягам тыдня бачым яго ў розных аддаленых месцах: Гродне, Вільні, Саколцы, Беластоку, Слоніме. Яго імпэт і непаседлівасць даводзяць да шалу сышчыкаў і паліцыю. Каліноўскага баяцца дваране. Ягоны прыезд у маёнткі назначаны страхам, памешчыкі вымушаны даваць коней і харчы, сустракаць і гасціць дыктатара, праводзіць аж па-за межы сваіх удладанняў. Пасля кожнай сустрэчы з „Хамуцісам" астаецца неразгаданы страх.

Закалот вакол выявы рэвалюцыянера незразумелы ў час карцінкавай цывілізацыі. Справа ў тым, што захавалася яго фатаграфія ў поўны рост з 1862 года. Аўтар здымка, італьянец Ахіле Банольдзі, сімпатык і паплечнік Паўстання 1863-1864 гг. Фатаграфія трапна аддае бясстрашны характар паўстанца-фанатыка. Кантакт са здымкам можа прывесці да шакіруючых высноваў. Атрымаецца так, што ў справе Каліноўскага паліцыйныя „малюнкі" больш трапныя і ўнушальныя за ўсё беларускае мастацтва.

* * *

Трэці раз у Мастаўляны паехала я ў канцы ліпеня 2009 года, разам з прафесарам Вячаславам Шведам з Гродна і дырэктаркай літаратурна-мастацкага архіва Ганнай Запартыкай з Мінска. Госці з Беларусі якраз пабывалі на Трыялогах у Віле Сакрата. Мяне, як аматарку старых гасцінцаў, папрасілі ў гіды. Такім чынам я трапіла зноў на панадворак Кастуся Каліноўскага, дзякуючы неацэннаму Сакрату Яновічу.

— Можа і ў саміх Мастаўлянах знаходзяцца магілы часткі роду Каліноўскіх, — падумаў уголас прафесар Швед. Інтуіцыя даследчыка паказалася геніяльнай. Справа ў тым, што ў Мастаўлянах захаваліся самыя старыя могілкі ў наваколлі. Некраполію на ўзгорку значыць мініяцюрная капліца пачатку 18 стагоддзя, рэлікт уніяцкай архітэктуры. Месца і будынак добра ведаў будучы паўстанец, паколькі каплічка і могілкі знаходзіліся непадалёк двара. Можна таксама дапусціць, што тут пахаваная частка сямі'і Вікенція Канстанціна. Бацька рэвалюцыянера быў двойчы жанаты і меў семнаццаць дзяцей. Паколькі ў цяперашніх Мастаўлянах толькі двое дзяцей (у бацюшкі), плоднасць сямейкі Каліноўскіх проста шакіруе. Магчыма і ад таго здзіўлення паяўляюцца ў біяграфіі Кастуся звесткі пра вялікую бяду і нястачу ў сям'і Каліноўскіх (бо ў бацькі было семнаццаць дзяцей), з-за чаго будучы рэвалюцыянер быў вымушаны працаваць у час вучобы ў Пецярбургу. Як вядома, на просьбу Віленскага археалагічнага таварыства, разам з братам Віктарам, перапісваў ён з архіваў старажытнабеларускія дакументы. Такім чынам, праца для хлеба спрычынілася да самаадукацыі па роднай гісторыі. У „Мужыцкай праўдзе" аўтар спасылаецца на нашы старыя кніжкі, ён таксама ставіць за ўзор патрыятызму нашага Тадэвуша Касцюшку. Ужо за гэтыя словы варта асвятляць Каліноўскага!

Тым больш, што гісторыя сям'і Каліноўскіх больш страшная за ўсякія літаратурныя і мастацкія выдумкі.

* * *

25 кастрычніка 1862 г. у Якушоўцы памірае на сухоты Віктар Сцяпан Каліноўскі, старэйшы брат і ідэйны настаўнік будучага кіраўніка паўстання ў Беларусі. Смерць брата Кастусь успрымае як наканаванне. Няма слоў, каб апісаць траўму пасля страты самага дарагога чалавека. Пасля смерці маці Кастусь гадаваўся пад уплывам Віктара, бачыў у ім братнюю душу, апірышча, дом. Раней памерла дзесяць ягоных родных братоў і сясцёр. Як не дзіўна, ён апошні з дванаццаці дзяцей са шлюбу Сямёна і Веранікі з Рыбінскіх, закончыў жыццё на шыбеніцы. (У другім шлюбе, з Ізабэлай Лазарэвіч, Сямён Каліноўскі меў яшчэ пяцёра дзяцей).

Мне толькі часткова ўдалося ўстанавіць імёны братоў і сясцёр Вікенція Канстанціна. Дакументы з 1832 года называюць трох: Кандрата (7 гадоў), Іосіфа (5 гадоў), Юрыя (2 гады). Пасля ў архіўных запісках сутракаем яшчэ брата Міхала, сясцёр Марыю-Іаанну, Юлію-Іосіфу, Казіміру-Юзэфу. Мне пашанцавала быць толькі на магіле Віктара Сцяпана ў Свіслачы. Але паколькі яна знаходзіцца ля самай капліцы, месца паказалася сімвалічным.

Калі я глядзела многія партрэты і скульптуры Вікенція Канстанціна і думала пра разнабой у трактоўцы ягонай выявы, заўсёды, пасля нейкага часу, з'яўляліся мысліі пра яго братоў і сясцёр, пра маці, растаптаных па-варварску ботам гісторыі. Быццам іх душы дамагаліся свайго вобразу і памяці.

(працяг будзе)

24.10 — 30.10

(22.03. — 20.04.) У пачуццях знакаміта — самотны Баран закрунецца каля асобы якая будзе ажыццяўленнем ягоных мараў. Затое клопаты з начальнікам або бацькам. Спешка можа быць згубнай, а інтуіцыя можа падвесці. Кругом мноства ветлівых людзей, але не слухай некрытычна іх парад.

(21.04. — 21.05.) Шчаслівейшыя дні. Дойдуць да цябе добрыя весткі, у інтарэсах, поспехі (клопаты на працы абернуцца табе ў дабро). Ды хіба не ў каханні. Пазбягай стрэсу і сітуацый, якія цябе мучаць, бо можаш трапіць да лекара.

(22.05. — 22.06.) Могуць дарвацца да цябе песімізм і сумненні. Хтосьці можа разлічыць цябе з тваёй безадказнасці. Ды можаш парвацца на адважныя інвестыцыі, ўдадуцца таксама інтэрэсы, якія ладзіш з сябрам.

(23.06. — 23.07.) Сатурн, які ідзе ў знак Шаляў (29.10.), ускалыхне тваім пачуццём бяспекі. Не чапай важных спраў. Будзеш аслаблены і стомлены. Ды пакіне цябе пачуццё, што ў тваім жыцці нічога не адбываецца; справы, якія валакліся, рушаць з капыта. Хоць будзеш скрыты і таямнічы; гэта табе не зашкодзіць, бо лепш не хваліцца сваімі планамі.

(24.07. — 23.08.) 24-28.10. — час цяжкіх выбараў. Лепш, аднак, устрымацца з важнымі рашэннямі, бо можаш паставіць на не таго бегуна. Будзь вельмі асцярожны — цікуюць аварыі, прыкрыя здарэнні, зласлівасць людзей.

(24.08. — 23.09.) Адчуеш, быццам хтосьці зняў з тваёй спіны цяжар. Пазбудзешся праблем, якія не давалі табе спаць. Лёгкасць на душы і пачуццё свабоды. Больш адважныя хады на працы; можаш шмат здабыць ды і зарабіць. У цане будуць твае кемлівасць і цярплівасць ды наватарства. Тваю матэрыяльную сітуацыю падтрымае Сатурн (рака грошай!).

(24.09. — 23.10.) Да 28.10. найбольш аптымізму, радасці. Рэальна ацэніш сітуацыю, паспяхова паправіш яе. Наладзіш цікавыя знаёмствы. Да чаго кранешся — усё пераменіцца ў поспех! Найбольшыя поспехі — у каханні.

(24.10. — 22.11.) Рушыш уперад поўным ходам. Будзеш моцны, упэўнены ў сваіх рацыях, што добра паўплывае на адносіны з атачэннем. Свае думкі і погляды выкажаш пераканаўча і ўсе паслухаюць цябе.

(23.11. — 22.12.) У гэтым тыдні найлепш было б табе адпачыць, схавацца ад гомону (вазьмі з сабой асобу, якая не любіць шуму). Ды варта пашукаць такіх людзей, якія будуць добрымі дарадчыкамі, а нават гуру ў справах важных для цябе. 30 і 31.10. якраз сябры будуць для цябе аракуламі-аўтарытэтамі. Хутка дагаворышся з людзьмі, аформіш кожную справу.

(23.12. — 20.01.) Настрой ненайлепшы, раздражненне, злосць (з-за патрабаванняў іншых і сваіх уласных). Ды не бойся выклікаў і не ўцякай ад іх! У каханні твае бесцырымонныя заляцанні могуць быць патрактаваны як нахабства.

(21.01. — 19.02.) Не выбірайся за мяжу, бо штосьці табе перашкодзіць. У пары можа варта адпачыць крышку адзін ад аднаго. Дзякуючы спрыту і інтэлігентнасці можаш шмат дасягнуць на працы (Сонца і Меркурый у знаку стойкага Скарпіёна). У матэрыяльных справах на зямлю сцягне цябе партнёр, запланує выдаткі і завядзе цябе ў краму!

(20.02. — 21.03.) Старайся захаваць аб'ектыўнасць (можаш быць так заслеплены, што страціш здаровы розум!). Урэшце задумаеш зрэалізаваць мары (будзеш пільны і дакладны). Не ангажуйся ў гэты рызыканцкі праект! Таксама візіт сваякоў не будзе самы мілы.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960